ПРАЛЕТАРЫІ УСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

Літаратура і Мастацтва

ОРГАН МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ І ПРАЎЛЕННЯ САЮЗА ПІСЬМЕННІКАЎ БССР

ГОД ВЫДАННЯ 32-гі № 24 (1765) | Пятніца, 22 сакавіка 1963 года. | Цана 4 кап.

РЭСПУБЛІКАНСКІ СХОД АКТЫВУ ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ

19 сакавіка адбыўся рэспубліканскі сход актыву творчай інтэлігенцыі.

З дакладам аб выніках сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва выступіў кандыдат у члены Прэзідыума ЦК КПСС, першы сакратар ЦК КП Беларусі К. Т. Мазураў.

У спрэчках па дакладу выступілі дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР акадэмік П. Ф. Глебка, сакратар праўлення Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР, рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» М. М. Фігуроўскі, народны мастак БССР Я. А. Зайцаў, народны артыст БССР Л. Р. Рахленка, намеснік старшыні праўлення Саюза кампазітараў БССР, народны артыст СССР Р. Р. Шырма, пісьменнікі А. М. Кулакоўскі, Г. М. Бураўкін, музыказнаўца Т. А. Дубкова, пісьменнік Т. К. Хадкевіч, музыказнаўца К. І. Сцепанцэвіч, намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР І. П. Шамякін.

З вялікім натхненнем удзельнікі сходу прынялі прывітальнае пісьмо ЦК КПСС, Першаму сакратару ЦК КПСС М. С. Хрушчову, у якім запэўнілі партыю, што работнікі літаратуры і мастацтва Беларусі аддадуць усе свае сілы і талент служэнню народу, вялікай справе будаўніцтва камунізма.

У рабоце нарады прынялі ўдзел т.т. Ц. Я. Кісялёў, В. І. Казлоў, П. М. Машэраў, І. М. Макараў, С. О. Прытыцкі, Ф. А. Сурганаў, Д. Ф. Філімонаў, В. Ф. Шаура, Л. Г. Максімаў.

(БЕЛТА).

ТВАРЫЦЬ ДЛЯ НАРОДА, У ІМЯ КАМУНІЗМА

ДАКЛАД КАНДЫДАТА Ў ЧЛЕНЫ ПРЭЗІДЫУМА ЦК КПСС, ПЕРШАГА САКРАТАРА ЦК КП БЕЛАРУСІ ТАВАРЫША К. Т. МАЗУРАВА

НА РЭСПУБЛІКАНСКІМ СХОДЗЕ АКТЫВУ ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫІ АБ ВЫНІКАХ СУСТРЭЧ КІРАЎНІКОЎ ПАРТЫІ І ЎРАДА З ТВОРЧАЙ ІНТЭЛІГЕНЦЫЯЙ У КРАМЛІ Ў СНЕЖНІ 1962—САКАВІКУ 1963 г г.

Таварышы!

Сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва, якія адбыліся 17 снежня 1962 года і 7—8 сакавіка гэтага года, — гэта выдатная падзея ў ідэйным і культурным жыцці нашай партыі і савецкага народа. У ходзе сустрэч, у абстаноўцы сапраўды ленінскай прынцыповасці і добразычлівасці меў месца жывы, свабодны, шчыры абмен думкамі па карэнных пытаннях мастацкай творчасці. Атмасфера аднадушша, добразычлівасці і ў той жа час высокай патрабавальнасці, якая панавала на сустрэчах, накшталт люстэрка, паказала адносіны, існуючыя паміж партыяй і творцамі мастацкіх каштоўнасцей, адносіны мудрага кіраўніка з яго вернымі вучнямі, памочнікамі ў важнай справе будаўніцтва новага жыцця, выхавання народа ў духу камунізма.

Вынікам сустрэч, іх вышэйшым, кульмінацыйным пунктам з'явілася вялікая, усхваляваная, глыбока тэарэтычна абгрунтаваная прамова Мікіты Сяргеевіча Хрушчова, сказаная ім 8 сакавіка гэтага года. У гэтай прамове увасобіліся бацькоўскія клопаты партыі, Цэнтральнага Камітэта, асабіста М. С. Хрушчова аб савецкай літаратуры і мастацтве, аб нашай творчай інтэлігенцыі: дакладна сфармуляваны важнейшыя тэарэтычныя палажэнні марксісцка-ленінскай эстэтыкі на сучасным этапе яе развіцця; вызначаны задачы літаратуры і мастацтва ў перыяд разгорнутага камуністычнага будаўніцтва.

Сустрэчы кіраўнікоў Камуністычнай партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва сталі добрай традыцыяй, своеасаблівымі аглядамі сіл літаратуры і мастацтва, іх творчай актыўнасці і рэвалюцыйнай баявітасці. На сустрэчы гаварылася, што Цэнтральны Камітэт нашай партыі задаволены становішчам спраў у літаратуры і мастацтве. Наша культура развіваецца на здаровай аснове і ў правільным напрамку, ідзе ў нагу з часам. Наша мастацтва верна служыць народу, дапамагае яму ў вялікай справе будаўніцтва новага жыцця.

Але, як адзначыў у сваёй прамове тав. М. С. Хрушчоў, было б шкодна перабольшваць поспехі літаратуры і мастацтва, не заўважаць сур'ёзных недахопаў у рабоце некаторых літаратараў, мастакоў, кампазітараў, тэатраў і дзеячоў кіно. Не ўсе яшчэ работнікі культуры правільна разумеюць задачы ў галіне літаратуры і мастацтва, змешчаныя ў Праграме партыі. У літаратуры і мастацтве, у жыцці творчых арганізацый намеціліся тэндэнцыі, што супярэчаць законам, па якіх жыве наша грамадства.

Некаторыя дзеячы ідэалагічнага фронту пачалі адыходзіць ад сацыялістычнага рэалізму, прынялі на ўзбраенне метады буржуазнага мастацтва — фармалізм і абстракцыянізм, выдаючы гэта за наватарства ў мастацтве. Сярод няспелай, няўстойлівай у ідэйных адносінах часткі творчай інтэлігенцыі атрымаў хаджэнне лозунг мірнага суіснавання сацыялістычнай і буржуазнай ідэалогіі ў нашым грамадстве.

Тлен фармалізму, буржуазнага індывідуалізму і аб'ектывізму паразіў творы раду пісьменнікаў і маладых паэтаў. Фармалістычныя выкрутасы дапусцілі некаторыя дзеячы кіно і тэатра, мастакі і скульптары, якія стварылі творы мудрагелістыя, незразумелыя шырокім народным масам, далёкія ад жыцця, заганныя ў ідэйных адносінах. Прычым, неразборлівыя і тэндэнцыйна настроеныя крытыкі расцэньвалі такія работы як шэдэўры савецкага мастацтва. Ілжэнаватарскія работы проціпастаўляліся ўсяму лепшаму, жыццесцвярджальнаму, што створана рэалістычным мастацтвам. Фармалізм і абстракцыянізм гэтыя дзеячы спрабавалі выдаваць за прамую дарогу сацыялістычнага мастацтва.

У апошні час некаторыя літаратары і работнікі мастацтва ўдзяляюць вялікую ўвагу ў сваёй творчасці таму перыяду жыцця савецкага грамадства, які звязан з культам асобы Сталіна. Тав. М. С. Хрушчоў адзначыў, што з'явіліся творы, у якіх праўдзіва, з партыйных пазіцый асвятляецца савецкая рэчаіснасць тых гадоў. Разам з тым у творчасці асобных літаратараў праявіліся памылковыя матывы і тэндэнцыі, якія заключаюцца галоўным чынам у тым, што ўся ўвага аднабакова сканцэнтроўваецца на фактах беззаконнасці, самавольства, злоўжывання ўладай.

М. С. Хрушчоў яшчэ раз на аснове марксісцка-ленінскага аналізу гістарычных фактаў ахарактарызаваў працэс узнікнення культу асобы Сталіна. Ён падкрэсліў, што партыя з усёй непрымірымасцю асудзіла і асуджае дапушчаныя Сталіным самавольства і злоўжыванні ўладай, якія наносілі сур'ёзную шкоду справе камунізма. Віна Сталіна ў тым, што ён зрабіў грубыя памылкі тэарэтычнага і палітычнага характару, парушаў ленінскія прынцыпы дзяржаўнага і партыйнага кіраўніцтва, злоўжываў даверанай яму партыяй і народам уладай. І пры ўсім гэтым партыя аддае належнае заслугам Сталіна перад партыяй і камуністычным рухам.

Трэба мець на ўвазе, адзначыў тав. М. С. Хрушчоў, тыя гады не былі перыядам застою ў развіцці савецкага грамадства. Пад кіраўніцтвам Камуністычнай партыі, пад сцягам ідэй і запаветаў вялікага Леніна наш народ паспяхова будаваў і пабудаваў сацыялізм. Савецкі Саюз быў ператвораны ў магутную сацыялістычную дзяржаву, якая вытрымала найцяжэйшыя ваенныя выпрабаванні, цалкам разграміўшы фашысцкія полчышчы.

У нас не перавяліся літаратары, якія чэрпаюць матэрыялы для сваіх твораў са смеццевай ямы і імкнуцца выдаць такія творы за праўдзівае асвятленне жыцця народа, літаратары, якія малююць рэчаіснасць згодна са сваімі прадузятымі, суб'ектывісцкімі ўяўленнямі аб ёй. Нельга лічыць праўдзівым паказам вобраза савецкага чалавека той худасочны цень, спляценне скептыцызму, бязволля, расслабленасці, песімізму і нігілізму, якія падсоўваюць нашаму чытачу і гледачу фармалістычныя трукачы, нясталыя вершаплёты і фальсіфікатары.

На сустрэчы востра крытыкаваліся мемуары І. Эрэнбурга «Людзі, гады, жыццё», як кніга, у якой аднабакова і скажона апісваецца наша рэчаіснасць, падзеі літаратурнага жыцця, выстаўляецца фальшывая тэорыя «маўчання», змешчана паклёпніцкае сцвярджэнне, быццам бы Ленін быў цярпімы да розных напрамкаў у літаратуры і мастацтве.

Уладзімір Ільіч Ленін указваў, што літаратура і мастацтва належаць народу, што яны павінны служыць інтарэсам рабочых і сялян, аб'ядноўваць пачуцці, думкі і волю народных мас, узнімаць іх. Палітыка Камуністычнай партыі ў мастацтве, палітыка непрымірымасці да любых буржуазных скажэнняў у гэтай галіне — гэта ленінская палітыка, яе цалкам і поўнасцю адабрае і падтрымлівае народ.

У пытаннях мастацкай творчасці ад кожнага дзеяча літаратуры і мастацтва наша грамадства, народ патрабуюць няўхільнага правядзення партыйнай лініі, выпрацаванага партыяй ленінскага курсу непрымірымасці да любых ідэйных хістанняў.

Адступнікі ад сацыялістычнага рэалізму спрабуюць сеяць недавер'е ў розумах моладзі да зусім ясных і выразных выступленняў партыі супраць тэндэнцый, чужых савецкаму мастацтву, выдаюць сябе за духоўных «настаўнікаў», духоўных «правадыроў» нашай моладзі. Яны выцягнулі на свет неіснуючую ў жыцці нашага грамадства праблему «бацькоў і дзяцей».

М. С. Хрушчоў у сваёй прамове так ахарактарызаваў сэнс іх сцвярджэнняў: дзецям хочуць унушыць, што іх бацькі не могуць быць настаўнікамі ў іх жыцці, і за парадамі да іх звяртацца няма чаго. Моладзь сама без парад і дапамогі старэйшых павінна вырашаць, як ёй жыць.

На практыцы гэта вядзе да адмаўлення ўсёй той велізарнай гістарычнай работы, таго каласальнага рэвалюцыйнага вопыту, які набыт старэйшымі пакаленнямі, нашай партыяй у гады барацьбы за ўстанаўленне Савецкай улады, у гады будаўніцтва сацыялізма і пабудовы камуністычнага грамадства.

Гэтыя тэндэнцыі праявіліся ў творчасці такіх маладых паэтаў, як Еўтушэнка, Вазнясенскі, Раждзественскі, пісьменнік Аксёнаў, кінарэжысёр Хуцыеў і інш., якія рэзка крытыкаваліся ў друку і ў час сустрэчы.

Менавіта гэтыя і некаторыя іншыя прадстаўнікі творчай моладзі спрабавалі зганьбіць пісьменнікаў, мастакоў і іншых работнікаў мастацтва старэйшага пакалення, паказаць старэйшае пакаленне, якое жыло і тварыла ў перыяд культу асобы, адсталымі людзьмі, прыстасаванцамі, «лакіроўшчыкамі» і г. д., проціпаставіць старэйшаму пакаленню моладзь, заражоную нігілістычнай бацылай скепсісу і адмаўлення.

Тав. К. Т. Мазураў гаворыць аб негрунтоўнасці такіх сцвярджэнняў і прыводзіць прыклады з кнігі Б. Грушына і В. Чыкіна «Споведзь пакалення». У ёй абагульнены адказы 17 тысяч маладых людзей на анкету «Інстытута грамадскай думкі» газеты «Комсомольская правда», апублікаваную ў 1961 годзе, дадзены супастаўленні дум і спадзяванняў нашай савецкай моладзі з настроямі зарубежнай моладзі.

Адказы на анкету нашай моладзі поўныя аптымізму, веры ў заўтрашні дзень, у будучыню.

Тэхнік В. Вільчынскі з Полацка піша:

«Мы жывём у цудоўны час. І ён цудоўны не тым, што мы багацей, чым раней, жывём, больш цікава працуем, весялей і лепш праводзім вольны час. Наш час цудоўны перш за ўсё таму, што сёння на нашых вачах і пры нашым удзеле будуецца камунізм. Мы — самае шчаслівае з усіх раней жыўшых пакаленняў, бо нам выпала самая ганаровая задача — завяршэнне будаўніцтва камунізма...

Нашы бацькі стварылі праект камуністычнага грамадства, расчысцілі месца для яго будаўніцтва, заклалі фундамент велічнага будынка, нарыхтавалі асноўныя матэрыялы...

Мы, будаўнікі камунізма, павінны быць цярпер асабліва нецярпімыя да ўсяго, што несумяшчальна з прынцыпамі камуністычнай маралі...»

Зусім па-іншаму глядзіць на жыццё маладое пакаленне ў буржуазных краінах. Вось што напісаў, напрыклад, семнаццацігадовы англічанін Джон Сіндэн: «Многія маладыя людзі маёй краіны не маюць мэты ў жыцці, не адчуваюць ніякай цікавасці да палітыкі, клапоцяцца і думаюць толькі пра сябе».

Французскі журналіст Мішэль Шэвалье некалькі тыдняў падарожнічаў у 1961 годзе па Заходняй Еўропе (Германіі), апытваючы моладзь пра мінулае, цяперашняе і будучае, і вывады яго такія: дэвіз жыцця моладзі капіталістычнага свету — грошы і забавы, яе будучыня — суцэльны туман. «У 50 працэнтаў моладзі няма наогул ніякай мэты. Толькі 50 працэнтаў чытаюць у месяц па адной кнізе». Пра амерыканскую моладзь і казаць няма чаго.

І вось з такой моладдзю некаторыя літаратары і работнікі мастацтваў спрабуюць параўноўваць цудоўную савецкую моладзь!

Партыя ніколі не дапусціць, каб у асяроддзе савецкай моладзі заносіліся норавы і маральныя прынцыпы, больш правільна, беспрынцыповасць моладзі капіталістычнага Захаду. Партыя не дапусціць, каб хто-б там ні быў браў на сябе ролю настаўніка моладзі. У яе ёсць і будзе толькі адзін настаўнік—КПСС, і ў гэтым яе шчасце і залог светлай будучыні.

Удзельнікі сустрэчы крытыкавалі тых дзеячоў ідэалагічнага фронту, якія сышлі з класавых пазіцый у мастацтве, забылі, што паміж дзвюма сацыяльнымі сістэмамі — сацыялізмам і капіталізмам ідзе вайна, ідзе вострая барацьба дзвюх ідэалогій — сацыялістычнай і буржуазнай, барацьба за розумы, сэрцы і душы людзей. Мы не маем права таму недаацэньваць небяспекі ідэалагічнай дыверсіі з боку буржуазіі.

«Мы хацелі б, — сказаў М. С. Хрушчоў,—каб нашы прынцыпы добра разумеліся ўсімі, асабліва тымі, хто спрабуе навязаць нам мірнае суіснаванне ў галіне ідэалогіі. Хто прапаведуе ідэю мірнага суіснавання ў ідэалогіі, той аб'ектыўна спаўзае на пазіцыі антыкамунізма. Ворагі камунізма хацелі б нашага ідэйнага раззбраення. І дасягнуць гэтай каварнай мэты яны спрабуюць праз прапаганду мірнага суіснавання ў ідэалогіі, пры дапамозе гэтага «траянскага каня», якога яны былі б рады ўвесці да нас».

Мірнага суіснавання сацыялістычнай ідэалогіі і ідэалогіі буржуазнай не было і быць не можа.

Творчая інтэлігенцыя нашай рэспублікі, — гаворыць тав. К. Т. Мазураў, — заўсёды была верным памочнікам Камуністычнай партыі. Беларуская літаратура і мастацтва — дзецішча Савецкай улады, таму што толькі ў гады Савецкай улады пачаўся іх сапраўдны росквіт. Нашы дасягненні ў галіне мастацкай творчасці агульнавядомыя. Мне думаецца, няма неабходнасці гаварыць аб гэтым падрабязна, таму што гэта тэма патрабуе асобнага вялікага даклада, ды і сабраліся мы не для таго, каб гаварыць пра нашы дасягненні, а больш для таго, каб выявіць і выправіць наяўныя недахопы.

Дзеячы літаратуры і мастацтва рэспублікі, як і ўсе працоўныя Беларусі, аднадушна адабраюць лінію Цэнтральнага Камітэта КПСС у пытаннях мастацкай творчасці, далучаюць свой голас да крытыкі няправільных тэндэнцый, якія праявіліся ў творчасці некаторых няспелых літаратараў і дзеячоў мастацтва. Тварыць для народа, у імя камунізма — пачэсны абавязак кожнага работніка літаратуры і мастацтва.

Далей тав. К. Т. Мазураў спыняецца на пытаннях развіцця беларускай літаратуры, адзначае, што паэты і празаікі рэспублікі пакуль яшчэ мала стварылі твораў, прысвечаных сучаснасці, а шэраг кніг, напісаных на сучасным матэрыяле, недастаткова глыбока і ўсебакова адлюстроўвае рэчаіснасць. Сярод беларускіх літаратараў ёсць такія, якія згушчаюць фарбы, малююць рэчаіснасць у змрочных тонах, выносяць на старонкі кнігі толькі крытыку, не паказваючы перспектыў развіцця. Безумоўна, трэба гаварыць пра недахопы, трэба біць па галоўных з іх. Але калі пісьменнік сканцэнтроўвае сваю ўвагу не на буйных праблемах, а пачынае капацца ў дробязях і не бачыць з-за іх свету, гэта нічога, акрамя шкоды, не прыносіць. Нельга цягнуць за сабой чытача ў балота песімізму, бесперспектыўнасці! Нельга ісці супраць жыццёвай праўды!

Усе, відавочна, памятаюць, як востра крытыкавалася аповесць Аляксея Кулакоўскага «Дабрасельцы», што дае скажоную карціну аб пасляваеннай беларускай вёсцы. Пісьменнік прызнаў гэту крытыку, але, як відаць, не зрабіў з яе глыбокіх вываду. Новая яго аповесць, падрыхтаваная да друку, па сутнасці паўтарае і паглыбляе памылкі, дапушчаныя ў «Дабрасельцах». Створаецца ўражанне, што тав. Кулакоўскі не ведае жыцця вёскі, не разумее працэсаў, якія адбываюцца ў ёй.

Некаторыя нашы крытыкі расхваляваюць, напрыклад, апавяданне пачынаючага празаіка Івана Чыгрынава «Маці». Але ці варта яно пахвал? Галоўная гераіня апавядання—жонка кулака, маці фашысцкага паслугача, забойцы, які пакараны партызанамі. Аўтар спачувае яе адзіноцтву, праліве разам з ёю слёзы на магіле здрадніка. І. Чыгрынаў, прапаведваючы ў сваім апавяданні варожую нам тэорыю ўсёдаравальнасці, фактычна маральна апраўдвае здраду Радзіме, апаганьвае высокае і святое слова маці. Калі мы вымаўляем гэта слова, мы ўспамінаем пра другую маці — пра тую маці, якую паказаў людзям Максім Горкі, маці, якая аддае свайго сына вялікай справе рэвалюцыі, і сама становіцца ў рады змагароў.

Некаторыя нашы маладыя пісьменнікі аддаюць даніну модзе, якая ідзе з-за рубяжа, працягваюць у літаратуру секс, не спыняючыся перад грубым натуралізмам, становяцца на шлях фармалізму і эстэтства, пішуць пустыя, безыдэйныя кніжкі. Чытаеш такія, з дазволу сказаць, творы, і робіцца сорамна перад памяццю Пушкіна і Маякоўскага, Янкі Купалы і Якуба Коласа, і чырванееш за некаторых нашых паэтаў, крытыкаў і выдаўцоў.

Саюзу пісьменнікаў БССР трэба зрабіць самыя сур'ёзныя вывады з вынікаў сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва, павысіць патрабавальнасць да якасці творчай работы, больш увагі ўдзяляць выхаванню літаратурнай моладзі. Кіраўніцтва саюза і партыйная арганізацыя павінны больш настойліва змагацца за добрае імя беларускай літаратуры.

Наша выяўленчае мастацтва зарэкамендавала сябе ў цэлым як мастацтва ідэйна змястоўнае, рэалістычнае. Большасць мастакоў рэспублікі цвёрда стаіць на пазіцыях сацыялістычнага рэалізму. Нядаўна яны нядрэнна паказалі сваё майстэрства на Усесаюзнай мастацкай выстаўцы.

Аднак за апошнія некалькі гадоў і ў творчасці асобных мастакоў з'явіліся спробы адыходу ад рэалістычных традыцый, некрытычнае захапленне фармалістычнымі «шуканнямі». Адарванае ад жыцця, фармальнае эксперыментатарства нанесла сур'ёзную шкоду работам такіх таварышаў, як Шчамялёў, Малішэўскі, Якавенка, Грос і некаторыя іншыя.

Асабліва прыкметна гэта праявілася на апошняй рэспубліканскай мастацкай выстаўцы. Уражанне ўмоўнасці, нежыццёвасці вобразаў пакідаюць работы мастака Шчамялёва. Пачуццё незадаволенасці выклікала карціна мастака Малішэўскага «Вясна». Ператварыўшы рашэнне чыста маляўнічых задач у самамэту, ён адышоў ад сапраўднай праўды жыцця, ад яго хвалюючага багатага зместу.

Хочацца сказаць і пра творчасць Міхаіла Савіцкага. Гэта мастак сур'ёзны, думаючы. Ён імкнецца ўзнімаць вялікія, важныя тэмы. Аднак уражанне ад некаторых яго апошніх палотнаў застаецца такое, быццам бы ён глядзіць на жыццё з пункту гледжання фармальных схем нерэалістычнага мастацтва. Вобразы людзей у гэтых карцінах аказваюцца выпусташанымі, адхіленымі ад жыцця.

Мы не супраць наватарства і не супраць пошукаў у галіне выяўленчага мастацтва, але мы за тое, каб мастакі шукалі і паказвалі толькі тое, што з'яўляецца сапраўды знаходкай. Гэта вельмі добра выказаў у адной са сваіх работ вялікі вучоны-рэвалюцыянер К. А. Ціміразеў.

«Калі на выстаўцы (або, усё роўна, у літаратуры) спыняешся з недаўменнем перад адным з тых твораў, якія прынята абазначаць тэрмінам дэкадэнцтва, сецэсіянізму і інш., што апашліўся і нічога не выражае, звычайна чуеш у абарону такі аргумент: павінны ж вы прызнаць, што гэтыя людзі шукаюць новых шляхоў мастацтве? — Але гэта абарона ці не раўназначна прамому абуджэнню? Вялікія мастакі, вядома, таксама шукалі новых шляхоў, але яны паведамлялі свету толькі свае знаходкі, а свае «шуканні» захоўвалі ў сваіх майстэрнях або без жалю іх знішчалі».

Таварышы мастакі! Партыя заклікае вас да яркай, жыццесцвярджальнай творчасці, якая праўдзіва адлюстроўвае рэальны свет ва ўсёй разнастайнасці яго фарбаў. Толькі такое мастацтва будзе прыносіць людзям радасць.

Адным з найбольш любімых народам відаў мастацтва з'яўляецца музыка. Недахопы ў развіцці музычнай творчасці, пра якія гаварыў у сваёй прамове Мікіта Сяргеевіч Хрушчоў у поўнай ступені адносяцца і да становішча спраў у нашай рэспубліцы.

У апошнія гады ў рады кампазітараў Беларусі ўлілася здольная і творча актыўная група таварышаў, якая крыху ажывіла дзейнасць саюза. Паявіліся значныя творы ў розных жанрах.

Але ўсё ж музычная творчасць у нашай рэспубліцы прыкметна адстае ад патрабаванняў жыцця. Творы раду беларускіх кампазітараў напісаны на нізкім прафесіянальным узроўні, прымітыўныя, маюць павярхоўны падыход да адлюстравання буйных жыццёвых з'яў і тэм вялікага зместу.

Хіба можна лічыць нармальным, калі за апошнія пяць гадоў кампазітарамі Беларусі створана толькі адна опера і два балеты? Народ чакае ад творцаў музыкі і новых, яркіх, выразных песень, а іх няма. Не праяўляецца належных клопатаў аб стварэнні жыццярадаснай папулярнай музыкі для радыё, тэлебачання, эстрады.

Кампазітарам у рэспубліцы створаны ўсе неабходныя ўмовы для плённай дзейнасці. Задача партыйнай арганізацыі, праўлення саюза — паўней выкарыстоўваць наяўныя магчымасці і забяспечыць стварэнне музычных твораў, якія адпавядалі б патрабаванням народа.

Усеагульную любоў народа заваявала наша тэатральнае мастацтва, кіно. Актыўна развіваецца канцэртна-выканаўчая дзейнасць. Пра гэта сведчыць поспех некаторых нашых кінафільмаў, высокая ацэнка, якую атрымліваюць тэатральныя і канцэртныя калектывы ў час іх гастролей у рэспубліцы і па краіне.

І ўсё ж мы павінны больш патрабальна ставіцца да дзейнасці тэатральных калектываў, палепшыць кіраўніцтва развіццём кінамастацтва. На сцэнах тэатраў яшчэ пярэдка з'яўляюцца п'есы, якія не задавальняюць гледача. Некаторыя драматургі раздуваюць дробныя, не характэрныя для жыцця з'явы, навязваюць гледачу суб'ектывісцкія погляды і меркаванні.

Нядаўна Брэсцкі драматычны тэатр паставіў п'есу П. Васілеўскага «Дзіўны дом». Бясспрэчна, працуючы над п'есай, пісьменнік кіраваўся добрымі намерамі. Але ён не ўлічыў, што пяро драматурга — гэта такая зброя, якой трэба ўмець карыстацца, і калі драматург ідзе ў наступленне, то трэба прыцэльвацца як след. А вось Васілеўскі выстраліў па свайму генералу. Гэта і ў пераносным і ў літаральным сэнсе. Справа ў тым, што героем п'есы з'яўляецца генерал у адстаўцы, якога аўтар так вымазаў дзёгцем, што былыя салдаты проста не пазнаюць свайго камандзіра. Па волі драматурга дасталося і свіце генерала, ад'ютантам і ардынарцам, гэта значыць людзям, якія жывуць і працуюць разам і побач з ім. П'еса атрымалася ўшчэрбнай, выклікала незадавальненне гледачоў. Магчыма, драматург і сустракаў у жыцці такога генерала. Але гэта не дае яму права рабіць абагульненні на аснове адзінкавых фактаў.

У нашым жыцці сустракаюцца і бюракраты, і хціўцы, і дармаеды, і маральна паўшыя тыпы. Але ж, ствараючы мастацкі твор, літаратар, дзеяч мастацтва стварае перш за ўсё абагульнены партрэт. І таму павінен умець убачыць і адабраць характэрнае, умець стварыць такія вобразы, якія адлюстроўвалі б усю шматграннасць нашага жыцця. Любая тэндэнцыйнасць можа зламаць задуму аўтара, накіраваць вастрыё ідэалагічнай зброі не супраць нашых ворагаў, а супраць сяброў.

Тав. М. С. Хрушчоў у сваім выступленні перад работнікамі літаратуры і мастацтва гаварыў, што галоўная задача савецкай літаратуры і мастацтва заключаецца ў тым, каб узнавіць у ярких мастацкіх вобразах вялікі і гераічны час будаўніцтва камунізма, праўдзіва адлюстраваць усталяванне і перамогу новых, камуністычных адносін у нашым жыцці. Мастак павінен умець убачыць станоўчае, радавацца гэтаму станоўчаму, якое складае сутнасць нашай рэчаіснасці, падтрымліваць яго.

На сустрэчы ў Маскве ўказвалася на сур'ёзныя недахопы ў дзейнасці Саюза кінематаграфістаў краіны і многіх кінастудый. Мы ўсе бачым і высока ацэньваем дасягненні ў галіне мастацкай кінематаграфіі. І разам з тым лічым, што дасягнутае не адпавядае нашым задачам і тым магчымасцям, якія маюць работнікі кінамастацтва. Савецкія людзі чакаюць ад дзеячоў кіно яркіх, хвалюючых фільмаў, у якіх узнімаліся б значныя сацыяльныя і маральна этычныя праблемы. А чаго ж грахі таіць, і на кінастудыі «Беларусьфільм» часта захвальваюць пасрэдныя, а то і зусім дрэнныя карціны, узносяць іх да ўзроўню шэдэўраў кінамастацтва. І горш таго, захвальванне пачынаецца яшчэ да выхаду фільма на экран.

Не ўсе работнікі кіно ўмеюць аб'ектыўна ацэньваць вынікі сваёй работы, правільна ўспрымаць крытыку. Хіба клопаты пра фільм — гэта клопаты толькі аб прэстыжы сцэнарыста і рэжысёра? Хіба, нарэшце, грамадства, якое дае ім сродкі на пастаноўку фільма, не мае права патрабаваць ад іх добрую прадукцыю?

Наша кінастудыя цяпер папаўняецца маладымі здольнымі кадрамі. Будзем спадзявацца, што яны створаць добрыя, праўдзівыя мастацкія творы, якія адпавядаюць сучасным патрабаванням.

Далей тав. К. Т. Мазураў спыняецца на праблемах літаратуразнаўчай і мастацтвазнаўчай крытыкі ў рэспубліцы, адзначае, што яна рэдка ўзнімае вялікія праблемы сучаснасці, недастаткова актыўна распрацоўвае пытанні народнасці і партыйнасці ў літаратуры і мастацтве. Вядучыя крытыкі слаба адгукаюцца на падзеі дня, і часта ў літаратуры і мастацтве пагоду спрабуюць рабіць людзі нявопытныя і малападрыхтаваныя. Некаторыя з іх схіль-

[Заканчэнне на 2-й стар.].

* Даклад публікуецца па скарочанай стэнаграме.

Наша хроніка

РОЗНЫМІ ФОРМАМІ І МЕТАДАМІ

На абанеменце Ашмянскай раённай бібліятэкі 800 чытачоў. Прыкладна столькі ж наведвальнікаў у чытальнай зале. З імі бібліятэкары праводзяць значную работу. Тут сістэматычна адбываюцца канферэнцыі чытачоў, арганізоўваюцца выстаўкі, стэнды.

— Чым жыве бібліятэка ў гэтыя дні? — такое пытанне задаў наш карэспандэнт работнікам гэтай культасветустановы. З Ашмян паведамілі:

— Разам з Домам культуры праведзена цікавая літаратурная канферэнцыя па раману «Трывожнае шчасце» І. Шамякіна. Аб выхаваўчым значэнні кнігі, аб героях твора гаварылі ўдзельнікі канферэнцыі Л. Кузьменка, А. Рапапорт, М. Шаршнёва і інш. У канферэнцыі прыняло ўдзел шмат чытачоў.

Днямі пачала працаваць выстаўка. На ёй матэрыялы сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з работнікамі літаратуры і мастацтва, шмат кніг па гісторыі развіцця савецкай музыкі, скульптуры, мастацтва. Абсталяваны стэнд «Чытайце родную беларускую літаратуру». На стэндзе — лепшыя раманы, аповесці, вершы, апавяданні беларускіх пісьменнікаў. Укамплектавана тэматычная паліца па беларускай літаратуры.

ДЛЯ АМАТАРАЎ МУЗЫКІ

Работнікі мінскага магазіна «Ноты» пачалі шырока прымяняць розныя формы прапаганды лепшых музычных твораў і літаратуры аб іх. Яны папаўняюць вітрыну «Навінак» лепшымі творамі рускай і замежнай музыкі. Тут ёсць сучасныя і старадаўнія песні, выданні з серыі «Выбрэныя ўрыўкі з савецкіх опер, араторый і кантат», сярод якіх—творы кампазітараў С. Пракоф'ева, Ц. Хрэннікава, Д. Шастаковіча, Ю. Шапорына і іншых. У аддзеле «Беларуская музыка» шырока прадстаўлены творы Ул. Алоўнікава, Я. Цікоцкага, А. Багатырова, М. Аладава, П. Падкавырава, Ю. Семянякі.

У вялікім выбары магазін мае музычную класіку, творы для школьнікаў і моладзі, народныя песні і танцы. Работнікі магазіна з задавальненнем выконваюць таксама заказы пакупнікоў з іншых гарадоў. Так, нядаўна яны паслалі пасылкі ў Маладзечна, Клецк, Нясвіж. Гэта партытура, ноты, кнігі па музыцы, вучэбныя дапаможнікі для мясцовых музычных школ і вучылішчаў.

У ДАПАМОГУ УНІВЕРСІТЭТАМ КУЛЬТУРЫ

У бліжэйшыя дні на экраны рэспублікі выпускаецца рад новых кінафільмаў па мастацтву.

З вялікай цікавасцю прагледзяць гледачы хранікальна-дакументальную кінакарціну «Дзмітрый Фурманаў», створаную на Ленінградскай студыі кінахронікі.

...Ёсць мастакі, якія валодаюць цудоўным талентам: на ўсё жыццё захоўваюць яны ў сваёй творчасці любоў да тых месц, дзе нарадзіліся, і вернасць тым людзям, сярод якіх выраслі. Такім мастаком з'яўляецца Сямён Афанасьевіч Чуйкоў. Вось ужо больш гарака гадоў вобразы роднай Кіргізіі зноў і зноў ажываюць на яго палотнах.

З любоўю і захапленнем стварае мастак цыкл карцін аб простых людзях Індыі.

Аб жыцці і творчасці народнага мастака Кіргізіі і Расійскай Федэрацыі, які сустракае сваё шасцідзесяцігоддзе новымі задумамі, расказвае каляровая навукова-папулярная кінакарціна «Мастак Сямён Чуйкоў» вытворчасці кінастудыі «Кіргізфільм».

З цікавасцю прагледзяць гледачы і новы хранікальна-дакументальны фільм «Справа варта была таго, Джэк!», прысвечаны жыццю цудоўнага чалавека, амерыканскага журналіста, камуніста Джона Рыда.

РАМАНТЫКА БУДНЯЎ

Сустрэча кіраўнікоў Камуністычнай партыі і Савецкага ўрада з работнікамі літаратуры і мастацтва ў цэнтры ўвагі работнікаў Барысаўскага гарадскога Дома культуры. Днямі тут адбылася цікавая гутарка на тэму «Рамантыка будняў савецкага чалавека». Пра герояў кніг, якія сталі прыкладам для савецкай моладзі, гаварылі ў сваіх выступленнях работнік гаркома партыі К. Важэніна, пенсіянер В. Белтаў, бібліятэкарка М. Ціхановіч і іншыя.

Хутка ў Доме культуры адбудзецца літаратурны дыспут «На каго б ты хацеў быць падобным». Да дыспута рыхтуецца моладзь буйнейшых прадпрыемстваў горада, навучэнцы, хатнія гаспадыні. Яны чытаюць творы Я. Коласа, М. Лынькова, І. Шамякіна, І. Мележа і іншых беларускіх пісьменнікаў.

СЕМІНАР БІБЛІЯТЭКАРАЎ

Як арганізаваць прапаганду лепшых твораў савецкай літаратуры і мастацтва—гэтае пытанне абмяркоўвалі работнікі бібліятэк Шклоўскага раёна на чатырохдзённым семінары, які адбыўся нядаўна. У аснову выхаваўчай работы бібліятэкары вырашылі пакласці заўвагі і парады, выказаныя М. С. Хрушчовым на сустрэчы з работнікамі літаратуры і мастацтва ў Крамлі. На семінары быў складзены рэкамендацыйны спіс літаратуры. Ён складаецца з лепшых твораў савецкіх пісьменнікаў, прац па літаратуразнаўству і эстэтыцы.

У рабоце семінара прыняло ўдзел 60 бібліятэчных работнікаў раёна.

ТВАРЫЦЬ ДЛЯ НАРОДА, У ІМЯ КАМУНІЗМА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.].

ны ацэньваць з'явы літаратуры і мастацтва з пункту гледжання адцягненага разумення «таленавітасці» аўтара, як быццам сапраўдны талент можна разглядаць у адрыве ад таго зместу, які ім выражаецца.

Дрэнную паслугу беларускай літаратуры аказвае, напрыклад, крытык Каваленка, які расхвальвае слабыя бакі творчасці некаторых літаратараў. У сваім артыкуле «Думкі пра сучасны беларускі раман», апублікаваным у першым нумары часопіса «Полымя» за 1963 год, ён допускае блытаніну ў тэарэтычных пытаннях, прадузятасць у ацэнцы пісьменнікаў, закрэслівае працу лепшых прадстаўнікоў творчай інтэлігенцыі старэйшага пакалення, якія так многа зрабілі для развіцця літаратуры і мастацтва.

Сур'ёзныя памылкі ёсць у радзе іншых крытычных работ, у выступленнях удзельнікаў дыскусіі, якая вядзецца ў газеце «Літаратура і мастацтва», па пытаннях літаратуры, В. Быкава, В. Тараса і некаторых іншых таварышаў.

Паўстае пытанне, хіба ў нас няма каму выступаць у друку і рабіць прафесіянальна пісьменны разбор створаных літаратурных твораў або твораў мастацтва, які правільна арыентаваў бы чытачоў і быў карысны аўтару? Наадварот, людзей, якія валодаюць багацейшым вопытам і ведамі ў галіне літаратуры і мастацтва, ёсць нямала, але яны недастаткова актыўна адгукаюцца на запатрабаванні часопісаў, газет, радыё і тэлебачання.

У радзе выпадкаў рэдакцыі газет і часопісаў, у тым ліку «Полымя», «Маладосць», «ЛІМ», не прад'яўляюць сур'ёзнай патрабавальнасці да адбору публікуемых літаратурных твораў і крытыка-бібліяграфічных матэрыялаў.

Роля нашага друку, радыё і тэлебачання ў барацьбе за партыйнасць і народнасць у літаратуры і мастацтве выключна вялікая. У сваёй штодзённай рабоце яны павінны пастаянна праяўляць наступальны дух і партыйную прынцыповасць у ацэнцы твораў, быць баявымі, палымянымі прапагандыстамі ідэй сацыялістычнага рэалізму.

Тав. К. Т. Мазураў выказвае некаторыя заўвагі па архітэктуры. Характэрным для творчасці беларускіх архітэктараў за апошнія гады стала вырашэнне вялікіх горадабудаўнічых тэм, звязаных з пытаннямі раённай планіроўкі, генпланаў гарадоў, праектавання буйных жылых комплексаў — жылых раёнаў і мікрараёнаў. З'явіўся рад новых сучасна вырашаных будынкаў, інтэр'ераў грамадскіх і гандлёвых памяшканняў. Створана нямала тыпавых праектаў жылых і культурна-бытавых будынкаў. Архітэктары пачалі больш думаць аб індустрыялізацыі будаўніцтва.

Разам з тым, і ў нас допушчана недаацэнка важнасці ансамблевай забудовы. Прыкладам можа служыць забудова вуліцы Якуба Коласа ў Мінску і Магілёўскай шашы. У горадабудаўніцтве праяўляюцца элементы фармалізму і дрэннага густу. Гэта можна бачыць на афармленні новай гасцініцы і рэстарана «Спадарожнік» у Мінску (архітэктар Барсукоў, мастак Малкін), у афармленні некаторых гандлёвых вітрын і г. д.

Нашы архітэктары і будаўнікі павінны, вырашаючы як галоўную задачу стварэнне выгод для чалавека, клапаціцца аб тым, каб кожнае збудаванне было ўвасабленнем высокага эстэтычнага густу.

Ленінскі курс — вось адзіны і верны курс у развіцці савецкай літаратуры і мастацтва. Нашаму народу — будаўніку камунізма — патрэбны творы літаратуры і мастацтва, якія маглі б авалодаць сэрцамі і розумамі савецкіх людзей, апявалі яго гераізм і подзвігі, узвышалі чалавека, паказвалі прыгажосць нашага жыцця і барацьбы, клікалі наперад.

Партыйным арганізацыям і кіраўнікам творчых саюзаў трэба заўсёды змагацца за партыйнасць у літаратуры і мастацтве, дамагацца, каб усе пісьменнікі, мастакі, артысты, дзеячы кіно няўхільна кіраваліся ў сваёй працы прынцыпамі сацыялістычнага рэалізму. Для выхавання ўсіх дзеячоў ідэалагічнага фронту — і «маладых» і «старых» — неабходна шырока выкарыстоўваць прамову М. С. Хрушчова на сустрэчы ў Крамлі, якая з'яўляецца важнейшым тэарэтычным дакументам па пытаннях эстэтыкі на сучасным этапе камуністычнага будаўніцтва.

Таварыш М. С. Хрушчоў падкрэсліў, што дзейнасць пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, скульптараў, работнікаў кіно і тэатраў, усёй творчай інтэлігенцыі павінна пастаянна знаходзіцца ў полі зроку партыі і народа.

Савецкі народ будуе камуністычнае грамадства. Галоўная мэта партыі ў будаўніцтве камунізма — стварэнне ўмоў для лепшага жыцця людзей працы. Для гэтага перш за ўсё трэба стварыць матэрыяльна-тэхнічную базу — забяспечыць высокі індустрыяльны ўзровень нашай прамысловасці, высокі ўзровень развіцця сельскай гаспадаркі, дабіцца выпуску такой колькасці тавараў народнага ўжытку каб задаволіць усе запатрабаванні народа, каб стварыць поўнае багацце. Вось чаму галоўныя намаганні партыі сканцэнтраваны ў галіне гаспадарчага будаўніцтва.

Але не менш важнай задачай з'яўляецца і ідэалагічная работа сярод мас. Камунізм будуецца працай і толькі працай мільёнаў. Нашы поспехі ў стварэнні матэрыяльна-тэхнічнай базы камунізма залежаць перш за ўсё ад таго, наколькі кожны з працоўных пранікнецца адказнасцю за лёс нашых планаў камуністычнага будаўніцтва, наколькі поўна будзе ён аддаваць свае сілы той справе, якую выконвае. Поспехі ў стварэнні камуністычнай эканомікі залежаць ад узроўню свядомасці людзей, якія сваёй непасрэднай працай ствараюць багацце.

Задача камуністычнага выхавання заключаецца ў тым, каб мы ўжо сёння, цяпер, штодзённа выхоўвалі чалавека камуністычнай будучыні, гэта значыць чалавека, які вызначаецца высокай ідэйнасцю, уменнем пераадольваць цяжкасці, высока адукаванага і свядомага працаўніка камуністычнага грамадства.

У бітве за камунізм, у барацьбе за фарміраванне чалавека — будаўніка камунізма галоўнае вастрыё ідэалагічнай работы павінна быць накіравана супраць перажыткаў мінулага ў свядомасці людзей, супраць тлятворнага ўплыву буржуазнай ідэалогіі.

Мы не маем права забываць, што аслабленне ідэалагічнай накіраванасці савецкай літаратуры, мастацкай творчасці стварае ўмовы для пранікнення ў асяроддзе савецкіх людзей буржуазнай літаратуры, буржуазнага мастацтва, буржуазнай ідэалогіі. М. С. Хрушчоў у сваім выступленні падкрэсліў: рэвалюцыя — гэта не добранькія пажаданні, гэта суровая і вострая барацьба. За рэвалюцыю трэба змагацца не толькі ў ходзе яе здзяйснення, але і ў перыяд умацавання яе заваёў, аж да пабудовы камунізма. Тут мала адных рэфератаў, лекцый, дакладаў, неабходны ўдзел і ў перастрэлцы, калі гэтага патрабуюць акалічнасці.

Наша партыя заўсёды стаяла за партыйнасць у літаратуры і мастацтве. Яна будзе падтрымліваць усіх літаратараў і работнікаў мастацтва, што стаяць на пазіцыях камуністычнай ідэйнасці, клапаціцца аб тым, каб раслі і мацнелі творчыя сілы рэвалюцыйных мастакоў, якія паслядоўна і актыўна адстойваюць у сваёй творчасці перамаганосныя ідэі марксізма-ленінізма.

Абстракцыянізм, фармалізм, за права існавання якіх у сацыялістычным мастацтве выступаюць некаторыя іх прыхільнікі, ёсць адна з форм буржуазнай ідэалогіі. А мы стаім на класавых пазіцыях у мастацтве і рашуча выступаем супраць мірнага суіснавання сацыялістычнай і буржуазнай ідэалогіі.

Наша партыя ўзначаліла грамадска-палітычнае жыццё савецкіх людзей і накіроўвае іх намаганні да дасягнення адзінай мэты — пабудовы камунізма. Партыя выказвае спадзяванні народа, і таму яе воля — воля народа. Натуральна, што як кіруючая сіла грамадства, партыя ліквідуе перашкоды, якія парушаюць нармальнае жыццё людзей, і стварае неабходныя матэрыяльныя, культурныя і ідэйныя прадумовы для пабудовы камунізма. Партыя падтрымлівае толькі тыя творы літаратуры і мастацтва, якія натхняюць народ і згуртоўваюць яго сілы ў барацьбе за камунізм. Толькі творы вялікага рэвалюцыйнага, стваральнага пафасу даходзяць да глыбіні свядомасці чалавека, нараджаюць у ім высокія грамадзянскія пачуцці. Да стварэння іменна такіх твораў заклікае работнікаў літаратуры і мастацтва партыя.

М. С. Хрушчоў рэзка крытыкаваў разглагольстванні аб праславутай «абсалютнай свабодзе асобы», падкрэсліў, што і пры камунізме воля аднаго чалавека павінна падпарадкоўвацца волі ўсяго калектыву. Калі гэтага не будзе, то анархічнае свавольства ўнясе разлад і дэзарганізуе жыццё грамадства. Палітыка партыі адлюстроўвае інтарэсы гэтага сацыялістычнага грамадства ў цэлым, значыць, і кожнага чалавека паасобку. А палітыку партыі ажыццяўляе Цэнтральны Камітэт, надзелены давер'ем партыі. У пытаннях мастацкай творчасці, растлумачыў М. С. Хрушчоў, Цэнтральны Камітэт партыі будзе дабівацца ад усіх — і ад самага заслужанага, самага вядомага дзеяча літаратуры і мастацтва, і ад маладога, пачынаючага творчага работніка няўхільнага правядзення партыйнай лініі.

Сустрэча кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва ў Крамлі сведчыць аб тым велізарным значэнні, якое надае партыя, яе Цэнтральны Камітэт пытанням ідэалагічнай работы.

Партыйныя органы, пярвічныя партыйныя арганізацыі творчых саюзаў павінны арганізаваць абмеркаванне вынікаў нарады і вывучэнне яе дакументаў — выступлення Л. Ф. Ільічова і прамовы М. С. Хрушчова. Парторганы павінны дапамагчы творчым арганізацыям разабрацца з допушчанымі адступленнямі ад прынцыпаў партыйнасці і сацыялістычнага рэалізму ў творчасці тых ці іншых дзеячоў культуры і пераадолець гэтыя тэндэнцыі.

Вынікі сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва трэба разглядаць як патрабаванне паляпшэння кіраўніцтва ўсёй ідэалагічнай работай, павышэння ўзроўню дзейнасці ўсіх ідэалагічных арганізацый і ўстаноў. Трэба больш увагі ўдзяліць ідэйна-тэарэтычнай падрыхтоўцы саміх дзеячоў культуры, бо ацэнка жыццёвых з'яў і падзей тым ці іншым мастаком залежыць ад таго, на якіх ідэйных пазіцыях стаіць ён сам.

Неабходна больш займацца ідэйным выхаваннем мас працоўных, асабліва моладзі, каб лепш узброіць нашых людзей у барацьбе з ідэалагічнай дыверсіяй буржуазнай ідэалогіі. Трэба больш актыўна ствараць неабходную матэрыяльную базу для ідэалагічнай і культурнай работы ў масах. Нельга далей мірыцца з сур'ёзнымі недахопамі ў арганізацыі культурна-асветнай дзейнасці. Абкомам КПБ, міністэрствам і ведамствам, Белсаўпрофу, ЦК камсамола трэба сур'ёзна заняцца работай дамоў культуры, клубаў, асабліва сельскіх.

Пытанні, звязаныя з паляпшэннем работы сярод моладзі, абмяркоўваліся на пленуме ЦК КП Беларусі, на пленумах абкомаў партыі. На жаль, многія дзеявыя прапановы слаба ажыццяўляюцца. Неабходна ўзмацніць выхаванне моладзі на працоўных і рэвалюцыйных традыцыях нашага народа, прывіваць падрастаючаму пакаленню пачуцці патрыятызму, любві да Радзімы, да сацыялістычнай Бацькаўшчыны, выхоўваць у кожнага маладога чалавека асабістую адказнасць за выкананне планаў камуністычнага будаўніцтва.

Крыху больш як год аддзяляе нас ад гістарычнага XXII з'езда КПСС, але з якім размахам, з якой грунтоўнасцю ўжо разгарнулася работа па ажыццяўленню прынятай з'ездам велічнай праграмы камуністычнага будаўніцтва.

У савецкіх людзей ёсць усе падставы ганарыцца вынікамі сваёй працы. Дасягнута шмат. Але можна было б зрабіць яшчэ больш, калі б мы навучыліся выкарыстоўваць да канца магчымасці і перавагі нашага сацыялістычнага ладу.

Камуністычная партыя пільна сочыць за кожным участкам будаўніцтва новага грамадства, узнімае савецкіх людзей на пераадоленне цяжкасцей, падцягвае рэзервы. Партыя правяла перагрупоўку сіл, яшчэ ў большай ступені сканцэнтраваўшы іх на рашаючым напрамку — на паскарэнні прамысловай і сельскагаспадарчай вытворчасці. Эканоміка — аснова жыцця грамадства. Яе развіццё — ключ да вырашэння ўсіх іншых праблем сацыяльнага прагрэсу.

Кіруючыся марксісцка-ленінскім вучэннем, Камуністычная партыя смела пайшла на ломку старых, стрымліваючых наш рух наперад форм кіравання, каб стымуляваць магутныя крыніцы чалавечай энергіі, стварыць яшчэ больш прасторы для развіцця прадукцыйных сіл, далучыць кожнага працоўнага да непасрэднага, штодзённага, свядомага ўдзелу ў вырашэнні агульных задач.

У барацьбу за камунізм уводзяцца ўсё новыя сілы, і трэба, каб дзеячы літаратуры і мастацтва занялі дастойнае месца ў вялікім камуністычным наступленні, павысілі сваю актыўнасць ва ўсенароднай барацьбе за светлую будучыню, за ажыццяўленне Праграмы КПСС, праўдзіва, на поўную мастацкую сілу апявалі багацці нашай сацыялістычнай рэчаіснасці, з партыйнай смеласцю выкрывалі ўсё, што перашкаджае нам ісці наперад. Партыя кліча савецкую творчую інтэлігенцыю да згуртавання і дружбы на адзінай ідэйнай камуністычнай аснове, да наступлення на чалавеканенавісніцкую ідэалогію старога буржуазнага свету, да новых выдатных мастацкіх здзяйсненняў у імя савецкага народа, у імя камунізма.

* * *

Пасля даклада разгарнуліся спрэчкі. Удзельнікі сходу выказвалі гарачую падзяку Цэнтральнаму Камітэту партыі і асабіста таварышу М. С. Хрушчову за велізарную ўвагу і бацькоўскія клопаты аб развіцці савецкай літаратуры і мастацтва, за ленінскую непрымірымасць і паслядоўнасць у барацьбе з праяўленнямі буржуазнай ідэалогіі. Яны гаварылі пра высокі абавязак літаратараў і дзеячоў мастацтва, іх адказнасць перад народам, пра тое, што літаратура і мастацтва закліканы служыць вялікай справе камуністычнага будаўніцтва.

Першы выступае дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору Акадэміі навук БССР акадэмік **П. Ф. Глебка**.

— Сустрэча кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва, — гаворыць прамоўца, — застанецца ў маёй памяці на ўсё жыццё. На гэтай сустрэчы было шмат цікавых і змястоўных выступленняў, прасякнутых глыбокім хваляваннем за далейшы лёс нашай літаратуры і мастацтва.

Незабыўнае ўражанне на ўсіх удзельнікаў сустрэчы зрабіла яркая, сардэчная прамова таварыша М. С. Хрушчова, у якой дадзены глыбокі марксісцка-ленінскі аналіз, указаны шляхі далейшага развіцця нашай савецкай літаратуры і мастацтва.

У бітве за камунізм, сказаў таварыш М. С. Хрушчоў, важнейшае значэнне мае выхаванне ўсіх людзей у духу камуністычных ідэалаў. У выкананні гэтай задачы наша партыя надае вялікае значэнне літаратуры і мастацтву. І мяне, як і ўсіх работнікаў мастацкага фронту, бязмежна радуе, што партыя, яе ленінскі Цэнтральны Камітэт лічаць, што савецкая літаратура і мастацтва развіваюцца паспяхова і ў асноўным добра выконваюць свае задачы.

Але партыя адначасова і папярэджвае нас, што было б памылкова і шкодна пераўвялічваць поспехі літаратуры і мастацтва, не бачыць сур'ёзных недахопаў у рабоце пісьменнікаў, мастакоў, кампазітараў, дзеячоў кіно і тэатраў.

Прамоўца гаворыць аб тым, што дыскусія, якая ў апошні час вялася на старонках газеты «Літаратура і мастацтва», паказала, што ў тэарэтычных разважаннях асобных крытыкаў і пісьменнікаў ёсць сур'ёзныя памылкі. Сама дыскусія, на жаль, вялася на вельмі вузкім матэрыяле і не закранула важнейшых праблем развіцця беларускай літаратуры. У дыскусіі гаварылася не аб усіх літаратурных працэсах, а ў асноўным аб творчасці некаторых пісьменнікаў, галоўным чынам пачынаючых. У выступленнях крытыкаў і пісьменнікаў не былі пастаўлены карэнныя пытанні марксісцка-ленінскай эстэтыкі, пытанні партыйнасці і народнасці літаратуры, яе сувязі з жыццём.

Тав. Глебка падрабязна спыняецца на памылках, допушчаных удзельнікамі дыскусіі М. Стральцовым, В. Тарасам, А. Мальдзісам, У. Юрэвічам, В. Быкавым і іншымі. Так, напрыклад, В. Тарас, гаворачы аб традыцыях, назваў даваенную беларускую літаратуру літаратурай прастаты і наіўнасці. Ён заклікае пісьменнікаў паказваць у першую чаргу адмоўнае і не адлюстроўваць станоўчае ў нашай рэчаіснасці.

Шмат блытаніны допусцілі ўдзельнікі дыскусіі ў сваіх разважаннях аб так званых двух пакаленнях. Гэта «праблема» прыдумана некаторымі для таго, каб закрэсліць усё, што напісана старэйшымі пісьменнікамі рэспублікі, і незаслужана расхвальваць некаторых пачынаючых пісьменнікаў, якія допускаюць памылкі ў сваёй творчасці.

— Ясная ленінская палітыка Цэнтральнага Камітэта партыі па ўсіх закранутых на сустрэчы пытаннях літаратуры і мастацтва, — гаворыць у заключэнне тав. Глебка, — знайшла гарачую падтрымку сярод творчай інтэлігенцыі. Задача цяпер заключаецца ў тым, каб глыбока вывучыць і асэнсаваць указанні партыі, выслабаніцца ад усяго памылковага і наноснага, што мела месца ў нашай літаратуры, ствараць творы, вартыя нашага народа, нашай цудоўнай эпохі будаўніцтва камунізма.

Затым выступае сакратар праўлення Саюза работнікаў кінематаграфіі БССР, рэжысёр кінастудыі «Беларусьфільм» **М. М. Фігуроўскі**. Ён гаворыць аб велізарным уражанні, якое зрабіла на яго сустрэча кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва.

— Усе мы там яшчэ раз адчулі клопаты партыі аб развіцці савецкай літаратуры і мастацтва, аб творчай інтэлігенцыі, — гаворыць прамоўца. Няма сумнення, што адкрытая, добразычлівая размова кіраўнікоў партыі і ўрада з літаратарамі, мастакамі, кампазітарамі, артыстамі выкліча высокую актыўнасць сярод творчых работнікаў краіны, будзе садзейнічаць стварэнню новых твораў, адлюстроўваючых высокія маральныя якасці савецкіх людзей — будаўнікоў камунізма.

Тав. Фігуроўскі далей гаворыць аб тым, што кіраўніцтва студыі «Беларусьфільм» у апошні час прыняло рад мер, накіраваных на паляпшэнне работы студыі.

З вялікай увагай было выслухана выступленне народнага мастака БССР **Я. А. Зайцава**.

— Недахопы, якія маюць месца ў дзейнасці творчых саюзаў і асобных работнікаў, — гаворыць ён, — у значнай ступені тлумачацца тым, што мы, літаратары, мастакі і кампазітары, да гэтага часу жылі раз'яднана. Мы вельмі рэдка разам абмяркоўваем нашы агульныя задачы і асобныя творы як літаратараў, так і мастакоў і кампазітараў. А такое ж сумеснае творчае, таварыскае абмеркаванне аказвала б нам вялікую дапамогу.

Кожны творчы работнік павінен быць не толькі высокаадукаваным чалавекам, але і актыўным грамадскім дзеячом. Ён абавязан добра ведаць задачы, якія вырашаюць партыя і народ, бо без гэтага ён не можа ствараць паўнацэнных твораў. Трэба сказаць, што нашы творчыя саюзы і партыйныя арганізацыі рэдка прыцягваюць нас да грамадскай работы.

Сярод мастакоў Беларусі, на шчасце, няма абстракцыяністаў, аднак некаторыя з іх няправільна ацэньваюць асобныя перыяды ў развіцці савецкага жывапісу, цалкам усхваляюць дваццатыя і пачатак трыццатых гадоў, хоць нам вядома, што іменна ў той перыяд з'явіўся фармалізм у творчасці асобных мастакоў.

Партыйны сход, які прайшоў нядаўна ў нашым саюзе, паказаў, што мастакі Беларусі правільна разумеюць свае задачы, што яны цалкам і поўнасцю ўхваляюць палітыку нашай партыі ў развіцці літаратуры і мастацтва.

Каб папярэдзіць магчымыя памылкі, мы павінны праяўляць больш прынцыповасці ў ацэнцы твораў мастакоў. Возьмем, для прыкладу, выстаўком нашага саюза. Як ён часам падыходзіў да ацэнкі твораў? Калі гутарка ішла аб творах маладых мастакоў, то мы разважалі так: мастак малады, таленавіты, ён толькі спрабуе свае сілы і яго трэба падтрымаць, хоць карціна яшчэ і няважная. Не прад'яўлялася сур'ёзных патрабаванняў і да твораў старэйшых мастакоў. Зразумела, што такі беспрынцыповы падыход да ацэнкі твораў не садзейнічаў развіццю жывапісу, выхаванню маладых мастакоў, не ствараў у саюзе абстаноўку высокай прынцыповасці і творчай дружбы.

Далей тав. Зайцаў гаворыць аб недахопах у рабоце тэатральна-мастацкага інстытута. Тут не ўдзяляецца дастаткова ўвагі ідэйнаму выхаванню студэнтаў. Інстытут, гаворыць прамоўца, павінен выпускаць не проста мастака, а мастака-грамадзяніна, мастака-патрыёта, здольнага ствараць творы, вартыя нашага народа — будаўніка камунізма.

— Мы, дзеячы мастацтва, — заяўляе ў заключэнне тав. Зайцаў, — бязмежна ўдзячныя Камуністычнай партыі за пастаянныя клопаты аб нас і на гэтыя клопаты адкажам новымі творамі, якія праўдзіва адлюструюць гераічную барацьбу нашага народа за поўную перамогу камунізма.

На трыбуне народны артыст БССР **Л. Р. Рахленка**. Ён гаворыць аб высокім прызванні савецкай літаратуры і мастацтва, якія павінны несці чалавеку радасць, узнімаць яго на барацьбу за светлае заўтра — камунізм. Жыццё народа, яго барацьба, яго мары — вось што дае мастаку тэмы, сюжэты, натхненне, напаўняе яго творы вялікім зместам.

— Мы, — гаворыць прамоўца, — змагаемся за тэндэнцыйнасць мастацтва ў самым глыбокім, шырокім і высакародным сэнсе слова. Чаму? Таму, што тэндэнцыя нашага савецкага сацыялістычнага мастацтва — гэта самая гуманная тэндэнцыя. Камуністычная тэндэнцыйнасць не выключае творчай разнастайнасці, глыбіні, палёту фантазіі. Іменна наша тэндэнцыйнасць схіляе нас да наватарства, да пошуку. А гэта зарука росквіту савецкага мастацтва.

Наш народ адхіляе фармалістычнае трукацтва, таму што гэта не мастацтва, а пазбаўленыя жыццёвасці рэчы, абураючае праяўленне свайго выключна індывідуалістычнага ўспрыняцця жыцця. Я зусім не ўспрымаю абстракцыяністаў, не магу зразумець іх. Калі мы былі ў Польшчы на гастролях, там была адкрыта выстаўка польскіх і французскіх абстракцыяністаў. Я хутчэй прабягаў праз гэту залу далей, да твораў Яна Матэйкі — паглядзець палотны гэтага вялікага класіка рэалізму.

Адзін абстракцыяніст сказаў мне тады: «Вы пішаце карову, вам гэта падабаецца. А я пішу сваё адчуванне ад выпітага малака». Так, так. І вы паспрабуйце разбярыцеся — як быццам стаіць перад табой чалавек нармальны і гаворыць: «Я перадаю маё адчуванне ад выпітага малака».

Наш Тэатр імя Янкі Купалы набыў сваю славу і стаў любімым у народзе дзякуючы таму, што яго спектаклям заўсёды былі ўласцівыя народнасць і партыйнасць. Лепшыя спектаклі і работы над імі прынеслі тэатру поспех. Аднак сумна, што нас часам спрабуюць звесці з правільнага шляху, спрабуюць у драматычных творах падмяніць жыццёвыя канфлікты дробнымі непаразуменнямі. На гэтым тэатр і акцёр не вырастуць. Мы хочам, каб драматургі пісалі п'есы, у якіх паказвалася б уся веліч нашага чалавека — будаўніка камунізма.

— З пачуццём высокага хвалявання падымаешся на гэту трыбуну, — гаворыць намеснік старшыні Саюза кампазітараў БССР, народны артыст Савецкага Саюза **Р. Р. Шырма**. — Гэта адбываецца таму, што тут гутарка ідзе пра веліч нашай літаратуры і мастацтва, пра ўсё тое, чаму мы, кожны з нас, прысвяцілі цэлае жыццё.

Небывалага ў гісторыі чалавецтва развіцця дасягнула савецкая нацыянальная музыка. Таварыш М. С. Хрушчоў указваў, што кожны народ мае свае традыцыі ў музыцы і любіць свае нацыянальныя, народныя мелодыі і песні. Цяпер у агульным хоры галасоў, якія апяваюць наша жыццё, камунізм, гучаць галасы рускага і ўкраінца, беларуса і латыша, армяніна і казаха, усіх народаў нашай краіны.

Наша мастацтва ўсё глыбей уваходзіць у душу кожнага рабочага, кожнага калгасніка, кожнага савецкага чалавека. Праўда жыцця, праўда думак і пачуццяў савецкага чалавека — будаўніка камунізма, яго гераізм і гуманнасць, палымяная любоў да Радзімы знаходзяць сваё адлюстраванне ў мастацкіх творах сацыялістычнага рэалізму. Але вось у наш светлы храм мастацтва і літаратуры ўрываецца цёмны струмень — абстракцыянізм. Яго прадстаўнікі адмаўляюць Рэпіна, Глінку, Чайкоўскага, не прызнаюць Талстога. Ці можам мы мірыцца з гэтым? Не, мы павінны аб'явіць абстракцыянізму рашучую барацьбу.

Тав. Шырма падрабязна спыняецца на развіцці нашай музыкі. Жыццё вучыць, што жыве і працвітае тая музыка, якая перадае пачуцці і надзеі народа, выдатныя парывы яго душы. І тысячу разоў мае рацыю М. С. Хрушчоў, калі гаворыць: «Мы за музыку натхняльную, якая кліча на подзвіг ратны і на працу». Так, толькі такую музыку ўспрымае наш савецкі народ — змагар, стваральнік і будаўнік.

Мне хочацца, адзначае тав. Шырма, сказаць некалькі слоў аб уплыве так званай лёгкай музыкі, якая прасачваецца да нас з капіталістычнага свету. Яе прыносяць радыё, кіно, джазы, грамафонныя пласцінкі. І, як ні дзіўна, той-сёй лічыць яе народнай. У сапраўднасці ж яна псеўданародная, фальсіфікаваная і адлюстроўвае буржуазныя густы.

Прывёўшы прыклады тлятворнага ўплыву псеўданароднай музыкі на пэўную частку моладзі, Р. Р. Шырма пераходзіць да пытання аб выхаванні маладых мастакоў, музыкантаў. Задача ўсёй нашай грамадскасці заключаецца ў тым, каб выхоўваць у гэтай моладзі добрыя густы, глыбокія грамадзянскія пачуцці любві да працы, да нашай сацыялістычнай Радзімы.

Далей прамоўца гаворыць аб беларускай песні. Народ здаўна не расставаўся з песняй. З ёй ён ішоў на ратныя подзвігі, у песні выказваў ён сваю журбу, радасць і шчасце. На жаль, нашы кампазітары не часта радуюць нас добрай песняй. Праўда, цяпер намеціўся некаторы зрух. Багатыроў напісаў некалькі добрых твораў на тэксты нашых паэтаў. Плённа працуюць і іншыя кампазітары. У папрок ім можна паставіць толькі тое, што яны не заўсёды бываюць разборлівыя ў выбары паэзіі для сваіх песень. На крылах музыкі не панясеш далёка тое, што нельга несці. Таму паэзію трэба выбіраць такую, якая разам з музыкай хвалявала б сэрцы людзей.

Мы, радавыя салдаты музычнага мастацтва, гаворыць тав. Шырма, павінны аб'яднаць нашы намаганні, творчы вопыт і майстэрства для стварэння музычных твораў, вартых нашай эпохі.

Аб недахопах у сваёй творчасці гаворыць пісьменнік **А. М. Кулакоўскі**.

Малады паэт **Г. М. Бураўкін** падкрэсліў, што людзі, якія думаюць аб сваім народзе, аб Радзіме, а не аб узвелічэнні ўласнай асобы, не могуць прыняць абстракцыянізм, фармалістычнае трукацтва.

— Літаратура і мастацтва, — гаворыць тав. Бураўкін, — павінны выхоўваць новае пакаленне змагароў, пакаленне смелых, прыгожых, шчаслівых людзей, а не пакаленне недавучаных крыўляк, разбэшчаных нахабнікаў і цынічных скептыкаў. І таму я не магу прыняць творы тых пісьменнікаў, дзе піжонствуючыя героі з падкрэслена грубымі пачуццямі топчуць на хаду чужыя сем'і, здзекуюцца з чыстага кахання і светлай вернасці, з мар і працы, дзе кожная старонка прапахла шалупіннем замежных апельсінаў, дзе салёны пах поту высмейваецца, а праслаўляецца перагар кан'якоў.

Я не разумею і тых паэтаў, у якіх ёсць талент, але якія спрабуюць пісаць без косак і кропак, без вялікіх літар і без усякага сэнсу. Там, дзе няма думкі, не можа быць і мастацтва. І вельмі правільна зрабілі партыя і народ, сказаўшы моднікам: даволі вывіхаў, досыць клаунад. Трэба працаваць, працаваць сумленна, многа і сур'ёзна!

Г. М. Бураўкін спыніўся і на такім важным пытанні, як эстэтычнае выхаванне падрастаючага пакалення, прапаганда сярод школьнікаў лепшых твораў літаратуры і мастацтва.

Першае пытанне, на якім спынілася музыказнаўца **Т. А. Дубкова**, — гэта шырыня эмацыянальнай сферы мастацтва. Думка аб тым, што мастацкія творы закліканы быць крыніцай радасці і натхнення для мільёнаў людзей, не заўсёды правільна разумеецца, гаворыць яна. Некаторыя схільныя бачыць у гэтых словах патрабаванне пісаць, напрыклад, музыку толькі вясёлую, маршавую і, значыць, штучна звужаць сферу адлюстравання чалавечых пачуццяў. Але гэта памылковы пункт гледжання.

Душэўны свет нашых людзей вельмі багаты. Чалавек працуе і адпачывае, весяліцца і сумуе, і, калі мы хочам па-сапраўднаму паказаць жыццё народа, нам трэба выкарыстоўваць у сваёй творчасці ўсё багацце мастацкай палітры. У прамове М. С. Хрушчова названы два творы: «Ці хочуць рускія вайны?» Калманоўскага і «Ручнічок» Майбарады, розныя па эмацыянальнай сферы. Першы — патрыятычнага гучання, з ярка выражанай энергічнасцю, маршавасцю. Другі характэрны мяккасцю, лірычнасцю. Але абедзве песні абуджаюць добрыя пачуцці. Увесь сакрэт у тым, з якіх пазіцый падыходзіць да творчасці сам аўтар — аптыміст ён, ясна бачыць перспектыву ці заблытаўся ў дробных перажываннях свайго героя.

Не згаджаючыся з тымі музыказнаўцамі, якія апраўдваюць недахопы ў развіцці беларускай музычнай культуры, Т. А. Дубкова ўказвае на прычыны гэтых недахопаў. Адна з іх — малалікасць творчых кадраў. У Саюзе кампазітараў — 35 членаў. Калі ўлічыць, што ў яго ўваходзяць і музыказнаўцы, якія самі не ствараюць музыкі, то становішча з кампазітарскімі кадрамі стане яшчэ больш зразумелае. Тое ж можна сказаць і пра дырыжораў сімфанічных аркестраў.

Беларуская музыка не заражана нейкімі фармалістычнымі скажэннямі, адзначае тав. Дубкова. Але мы не можам закрываць вочы на тое, што ў нас сустракаецца іншая бяда — прымітывізм.

Непатрабавальнасць да сваёй працы, недастатковыя клопаты аб павышэнні прафесіянальнай падрыхтоўкі ў некаторых кампазітараў часам прыводзяць да з'яўлення на свет недапрацаваных твораў. На гэтыя недахопы неабходна звярнуць увагу праўлення Саюза кампазітараў.

— Таварыш М. С. Хрушчоў выказаў думкі партыі і народа аб сённяшнім стане літаратуры і мастацтва, аб іх баявых задачах у перыяд разгорнутага будаўніцтва камунізма, — гаворыць пісьменнік **Т. К. Хадкевіч**. — Многія пытанні, па якіх мы ў літаратурных колах нямала спрачаліся ў апошні час, атрымалі глыбокае марксісцка-ленінскае асвятленне.

І мы, літаратары, бязмежна ўдзячныя партыі і асабіста таварышу Хрушчову за іх па-ленінску ясныя словы, сказаныя на сустрэчы ў Крамлі.

Палітыка партыі ў адносінах да мастацкай творчасці — гэта ленінская палітыка, гэта далейшае развіццё ленінскіх прынцыпаў, галоўным з якіх з'яўляецца партыйнасць і народнасць у літаратуры і мастацтве.

Творы многіх нашых празаікаў выйшлі на ўсесаюзную арэну, заваявалі аўтарытэт ва ўсесаюзнага чытача. Гэта такія раманы, як «Крыніцы» І. Шамякіна, «Калі

[Заканчэнне на 3-й стар.].

БІЯГРАФІЯ МАСТАКА—

САПРАЎДЫ гэта так. І не выпадкова, калі я, павіншаваўшы Яўгенія Аляксеевіча Зайцава з прысваеннем яму звання народнага мастака БССР, папрасіў, як прадстаўнік рэдакцыі, сказаць некалькі слоў пра сябе, ён паціснуў плячыма: «Пра што тут гаварыць, хіба толькі пра тое, над чым я працую?»

...Гаворка гэтая адбывалася ў перапынку паміж пасяджэннямі выстаўкома, членам якога з'яўляецца Я. Зайцаў. Дарэчы, розных грамадскіх спраў у Яўгенія Аляксеевіча нямала. На працягу многіх гадоў ён нязменна выбіраўся ў праўленне і бюро партарганізацыі Саюза мастакоў Беларусі. Цяпер з'яўляецца членам праўлення Саюза мастакоў СССР. Апроч таго, ён член мастацкіх саветаў пры Мастацкім фондзе БССР і Беларускім дзяржаўным выдавецтве. Вялікую грамадскую работу вядзе ён і як член прэзідыума Беларускага таварыства культурных сувязей з заграніцаю. Яго пастаянна прызначаюць у склад розных журы, яму даводзіцца многа ездзіць, выступаць з гутаркамі і лекцыямі аб мастацтве...

— Усё гэта патрабуе шмат часу, — гаворыць Яўгеній Аляксеевіч. — Але і гэта патрэбна, бо без грамадскага жыцця немыслімa і жыццё творчае. Нельга ж мастаку замыкацца ў сценах сваёй майстэрні.

— А можа ўсё ж мы прадоўжым размову менавіта ў майстэрні, — прапанаваў я. — Паглядзім вашы работы.

Я. ЗАЙЦАЎ. «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе».

Але Яўгеній Аляксеевіч запратэставаў.

— Ужо тут давядзецца вам прабачыць мяне за негасціннасць, але зразумейце мяне правільна. Я вось гавару, што жыццё мастака не абмяжоўваецца сценамі майстэрні. І ўсё ж сам працэс творчасці працякае заўсёды ў адзіноце. Бо пакуль работа не закончана, нават выпадкова кінутае слова, заўвага — збівае, адцягвае. А ў мяне цяпер якраз у разгары вялікая работа. Яна яшчэ не закончана. Я шмат думаю над ёю, шукаю, спрачаюся сам з сабою. І пакуль яна не выкрышталізуецца ва ўсіх дэталях, пакуль не высветліцца для мяне самога, я, шчыра кажучы, проста баюся яе паказваць.

Я ўсё ж не стрымаўся і папрасіў хоць бы расказаць, што гэта за работа. Яўгеній Аляксеевіч спачатку неахвотна, а потым, захапіўшыся, пачаў расказваць. Задума мастака сапраўды цікавая і багатая. Адлюстраваць у адным творы абагулены вобраз рэспублікі — яе мінулае, цяперашняе, яе героіку барацьбы і працоўныя справы, паэтычнасць яе прыроды і прыгажосць яе людзей — задача нялёгкая, і не выпадкова Я. Зайцаў вырашыў увасобіць сваю задуму ў

ТВАРЫЦЬ ДЛЯ НАРОДА, У ІМЯ КАМУНІЗМА

[Заканчэнне. Пачатак на 1-й і 2-й стар.]

зліваюцца рэкі» П. Броўкі, «Людзі на балоце» І. Мележа, «Векапомныя дні» М. Лынькова, аповесць «Трэцяя ракета» В. Быкава і іншыя.

Але вось разгорнеш некаторыя працы беларускіх крытыкаў — скажам, кнігу А. Адамовіча «Беларускі раман», зборнік артыкулаў Ю. Канэ, прачытаеш у перыядычным друку артыкулы маладых крытыкаў В. Каваленкі, А. Яскевіча і некаторых іншых і дзіву даешся: да чаго ж яны часам пішуць з нелюбоўю да роднай літаратуры, да чаго ж стараюцца ачарніць тое, што прызнана чытачом, што прыносіць яму карысць. Напрыклад, крытык Я. Герцовіч, пішучы ў часопісе «Полымя» пра тры раманы Ул. Карпава, вышуквае толькі недахопы, каб зрабіць вывад, што ў гэтых раманах мала «чалавеказнаўства», самабытных характараў, дрэнная мова. Дарэчы, здзіўляе пазіцыя рэдакцыі «Полымя». Часопіс друкуе творы і тут жа праз некалькі нумароў дае свае старонкі для разносу іх.

Крытык П. Дзюбайла ў газеце «Літаратура і мастацтва» узяў амаль усе буйнейшыя творы апошніх гадоў, тэмы якіх у той ці іншай ступені звязаны з вытворчасцю, і агулам, нягледзячы на тое, што гэтыя творы розныя па майстэрству, раскрытыкаваў іх.

Спробы дэзарыентаваць чытача і саштурхнуць пісьменніка з правільнага шляху на абочыну асабліва прыкметныя ў артыкуле В. Каваленкі «Думкі пра беларускі раман», змешчаным у першым нумары «Полымя» за гэты год. Тут з незвычайнай лёгкасцю падтасоўваюцца факты, робяцца паспешлівыя вывады і ацэнкі, узнімаюцца на шчыт творы, у якіх чалавек паказваецца ізаляваным ад калектыву, ад грамадскіх інтарэсаў, як у рамане У. Караткевіча «Нельга забыць».

Тав. Хадкевіч далей грунтоўна разбірае некаторыя няўдалыя работы пачынаючых празаікаў, крытыкуе пазіцыю тых пісьменнікаў, якія непрынцыпова адносяцца да няўдач і зрываў сваіх таварышаў па пяру. У заключэнне прамоўца гаворыць:

— Мы абавязаны рашуча адмятаць усё дрэннае, наноснае, што пранікае ў нашу літаратуру, і па-таварыску, клапатліва аберагаць літаратурную моладзь ад чужых нам уплываў.

Аб высокім абавязку і вялікай адказнасці творчага работніка перад народам гаварыла член Саюза кампазітараў БССР музыказнаўца **К. І. Сцепанцэвіч.** Разам з усімі дзеячамі беларускага мастацтва,— адзначае яна, — кампазітары, музыказнаўцы і выканаўцы ўнеслі свой уклад у развіццё савецкай музычнай культуры. Створаны таленавітыя творы, у якіх апяваюцца гераічныя подзвігі нашых людзей, раскрываюцца іх думкі і надзеі.

Усё гэта, вядома, добра. Але пакуль можна сказаць толькі пра некаторыя поспехі. Недахопаў куды больш. Беларуская музыка яшчэ не загучала на поўны голас на ўсе саюзнай і міжнароднай арэне.

У нас мала песень, маршаў, танцаў. Не ўдзяляецца належнай увагі лёгкай музыцы. Па-за полем зроку кампазітараў рэспублікі апынуліся сімфанічныя мініяцюры, харавыя творы. Да гэтага часу ў нас няма беларускай нацыянальнай аперэты. Беларускія кампазітары і паэты захапляюцца ў асноўным лірычнымі матывамі, забываючы пра тое, што песня нам будаваць і жыць дапамагае, што яна павінна быць насычана грамадзянскім пафасам, глыбокім ідэйным зместам. Часам цяжка адрозніць аўтара той ці іншай песні, настолькі безаблічныя і шэрыя іх мелодыі.

Нікольк не лепшае становішча ў жанры танцавальнай музыкі. На танцавальных пляцоўках Мінска, напрыклад, вельмі рэдка гучаць мелодыі нашых кампазітараў. Мала мы ствараем твораў такога жанра, і таму часам пранікае ў быт людзей нізкапробны імпартны музычны тавар. Нам трэба часцей бываць у парках і клубах, уважліва прыглядацца да таго, як і што танцуюць людзі, што спяваюць, як праводзяць свой вольны час. Добрай эстраднай музыкай, добрай песняй мы павінны выгнаць з ачагоў культуры ўсё пошлае, наноснае, чужое духу нашага народа.

Расшыраць рамкі музычнай культуры народа павінны, зразумела, не толькі кампазітары, але і музыказнаўцы. Наш абавязак — агульнымі намаганнямі выхоўваць у людзей правільныя эстэтычныя густы, будзіць у іх цудоўныя душэўныя парывы. Важную ролю ў гэтай справе побач з лепшымі ўзорамі савецкай музыкі павінна заняць прапаганда класічных музычных твораў. Тут, на жаль, шмат недахопаў. Мы забываемся і пра іншае: выхоўваць добры мастацкі густ трэба з дзяцінства. У школах жа рэспублікі нездавальняюча арганізавана музычная адукацыя. Мала пішацца і твораў для дзяцей.

Сур'ёзныя недахопы ёсць у рабоце Саюза кампазітараў, гаворыць у заключэнне свайго выступлення тав. Сцепанцэвіч. Ён мала ўдзяляе ўвагі важнейшым пытанням мастацтва. У саюзе рэдка праводзяцца творчыя дыскусіі, адсутнічае дух прынцыповасці, крытыкі і самакрытыкі.

На трыбуне—намеснік старшыні праўлення Саюза пісьменнікаў БССР **І. П. Шамякін.** Ён гаворыць аб велізарным значэнні нядаўняй сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з творчай інтэлігенцыяй. У абстаноўцы глыбокай шчырасці і добразычлівасці праходзілі хвалюючыя гутаркі аб далейшым развіцці савецкай літаратуры і мастацтва. На сустрэчы яшчэ раз з усёй сілай пацверджаны ленінскія прынцыпы партыйнасці і народнасці мастацкай творчасці.

Беларуская савецкая літаратура, працягвае тав. Шамякін, на сваім шляху заўсёды кіравалася рэалістычнымі традыцыямі —традыцыямі Пушкіна, Някрасава, Талстога, Чэхава, Горкага, Маякоўскага, традыцыямі класікаў нашай нацыянальнай літаратуры Я. Купалы і Я. Коласа. Некаторыя фармалістычныя выкрутасы, якія мелі ў свой час месца ў творчасці асобных пісьменнікаў, гэтак жа бясслаўна скончыліся, як і пачаліся. Яны не маглі збіць беларускіх літаратараў з правільнай дарогі. Тым больш гэта немагчыма цяпер, калі мы маем такую згуртаваную, ідэйна загартаваную арганізацыю, якой з'яўляецца Саюз пісьменнікаў рэспублікі.

Паспяхова развіваецца наша літаратура ў пасляваенныя гады. Аб гэтым сведчаць многія кнігі прозы, паэзіі, якія выйшлі на ўсесаюзную арэну. Вядома, не ўсё ішло гладка, узнікалі ў нас і свае праблемы на розных этапах. Але мы заўсёды вырашаем іх агульнымі намаганнямі.

Аднак за апошнія год-два ў літаратурным жыцці адбываецца шмат непажаданага, часам шкоднага. Праўда, у нас няма ярка выражаных фармалістычных выкрутасаў, калі не лічыць асобныя вершы А. Наўроцкага, У. Караткевіча, І. Шклярэўскага. Затое, на жаль, шмат блытаніны ў крытычных работах. І не толькі блытаніны, але і водгаласаў тых няправільных «тэорый», пра якія гаварылася на сустрэчы ў Маскве. Здавалася б, добрая з'ява—прыход у крытыку новых імён. Але ў выніку слабай выхаваўчай работы ў Саюзе пісьменнікаў, у Інстытуце літаратуры Акадэміі навук БССР, дзе групуюцца асноўныя крытычныя кадры, маладыя крытыкі дапускаюць шмат памылковых сцвярджэнняў і думак.

Самая шкодная з такіх думак—гэта ўсё тое ж «размежаванне пакаленняў». Дзеляцца не наогул пакаленні, а літаратурныя пакаленні. Той-сёй спрабуе перакрэсліць усё, што зроблена ў беларускай літаратуры да XX з'езда партыі, амаль усе творы старэйшых пісьменнікаў аб'яўляюцца «дагматычнымі», «культаўскімі». А з таго, што напісана пасля XX з'езда, як правіла, узнімаюць на шчыт толькі творы пачынаючых аўтараў. Каму выгадна такое проціпастаўленне? Усе гэтыя непатрэбныя разважанні асабліва ярка выявіліся ў дыскусійных матэрыялах і артыкулах, якія апублікаваны за апошнія некалькі месяцаў на старонках газеты «Літаратура і мастацтва». Старшыня секцыі крытыкаў У. Юрэвіч, напрыклад, у сваім артыкуле ўмудрыўся па сутнасці абысці маўчаннем сапраўдныя дасягненні нашай беларускай літаратуры.

Іншы твор не выклікае сур'ёзных заўваг і пярэчанняў. Быццам бы ўсё на месцы: ёсць сюжэт, кампазіцыя, герой, як правіла, чалавек просты, звычайны. Але ў гэтым «проста чалавек», адзначае тав. Шамякін, па-мойму, і тоіцца сур'ёзны недахоп. Чытаеш адзін твор—нічога, а азнаёмішся з пяцю-дзесяццю і міжволі задаеш сабе пытанне—дзе ж герой, які павінен выхоўваць чытача, чаму ў такіх творах няма вобразаў камуністаў і камсамольцаў? Куды зніклі высокія парывы душы, сапраўдны гераізм? Куды падзелася рэвалюцыйная рамантыка? Магчыма, у таго ці іншага аўтара былі найлепшыя намеры, але аб'ектыўна атрымліваюцца творы, якія прыносяць мала карысці партыі і народу.

Савецкая літаратура, літаратура сацыялістычнага рэалізму павінна быць баявая і наступальная, падкрэслівае тав. Шамякін. З гэтай трыбуны я хачу запэўніць актыў творчай інтэлігенцыі, Цэнтральны Камітэт партыі, што беларускія пісьменнікі апраўдаюць ганаровае званне баявых памочнікаў партыі.

У заключэнне ўдзельнікі сходу з вялікім натхненнем прынялі прывітальнае пісьмо ленінскаму Цэнтральнаму Камітэту КПСС.

МЫ ЯШЧЭ, ДРУЖА, ПАХОДЗІМ...

23 сакавіка спаўняецца 50 год з дня нараджэння Васіля Казачэнкі, выдатнага ўкраінскага пісьменніка, аўтара шырока вядомых аповесцей «Атэстат сталасці», «Сальвія», «Маланка», добрага друга беларускай літаратуры. Ён шмат зрабіў для папулярызацыі твораў беларускіх пісьменнікаў на Украіне. Па яго перакладах украінскія чытачы пазнаёміліся з раманам І. Шамякіна «Глыбокая плынь», аповесцямі Я. Брыля «На Быстранцы» і П. Пестрака «Камень» і іншымі творамі беларускай літаратуры.

Змяшчаючы слова Янкі Брыля пра Васіля Казачэнку, рэдакцыя горача віншуе юбіляра і жадае яму новых поспехаў у творчасці, ва ўмацаванні братніх сувязей паміж беларускай і ўкраінскай літаратурамі.

* * *

Пачынаючы з нашай першай сустрэчы ў верасні 1951 года, я шчасліва лічу Васіля Казачэнку адным са сваіх найбліжэйшых сяброў, мне часта і цёпла ўспамінаецца, што жыве недзе ў Кіеве цудоўны хлопец, з якім вельмі добра сустрэцца, голас якога прыемна пачуць і здалёк, сапраўдны чалавек, у сэрцы якога шчырасць твая заўсёды знойдзе братні водгук.

На паліцах маёй бібліятэкі выдатна суіснуе літаратурны інтэрнацыянал, у якім пачэснае месца займаюць кнігі сыноў і вучняў Шаўчэнкі, Франко, Кацюбінскага...

Некалькі кніжак з аўтографамі Казачэнкі. Адны з іх я проста чытаў у свой час, другімі жыў на працягу дзён і тыдняў, ахвотна даючы ім беларускае гучанне, некаторыя ўжо хочацца перачытаць.

Добры гэта занятак—чытаць, перакладаць і перачытваць сябравы кнігі. Добрая гэта радасць,—што кнігі яго з цікавасцю чытаюцца не толькі па дружбе.

Суровая і мужная, сардэчная і праўдзівая проза Васіля Казачэнкі падабалася б мне, напэўна, і тады, калі б я не ведаў яе аўтара асабіста.

Яшчэ лепш тое, што я ведаю яго, што я не толькі радасна вітаў і вітаю з'яўленне яго паасобных твораў, але ж гаварыў яму часам і горкую праўду, лічачы гэта сваім сяброўскім абавязкам.

Ён мне плаціў і плаціць той самай увагай, прыхільнасцю і шчырасцю ў ацэнках.

Разам з другімі беларускімі пісьменнікамі, я ўдзячны яму за добрыя пераклады і жывую прапаганду нашых твораў на Украіне.

Дарагі мой Васіль!

Што ж — пяцьдзесят, дык пяцьдзесят. Не буду гаварыць табе банальных фраз пра маладосць ды свежасць нашу, якая, бачыце, і цяпер... Жыццё застаецца жыццём, а нашага за нас ніхто не жыў.

Сёння мне асабліва прыемна ўспомніць і казачна аснежаны лес у Каралішчавічах пад Мінскам, дзе мы, беларускія літаратары, весела, шчыра віталі цябе, «нашага кіеўскага паўпрэда»; і майскі досвітак, зару за Дняпром ды за стэпамі, на якую мы, украінска-беларускія валацугі са спінінгамі, разам і ціха глядзелі з Чарнечай; і імклівы, пырскамётны кацярок на чыстых хвалях Нарачы, дзе і праз гул матора здарова гучалі нашы песні; і нашу з табой самотную і ненасытную размову на велічна-пустыннай ноччу Краснай плошчы...

Гартаць гады, гартаць старонкі—гэта і радасна, гэта і сумна. Пражыта намі, калі цвяроза ўзважваць, нямала, а зроблена—менш, чым хацелася б... Ну яе, парадласць юбілейную!.. Я табе ад душы, па-свойску жадаю не спыняцца надоўга на эпахальных прывалах, не вельмі прыслухоўвацца, як цябе хваляць, нават калі і шчыра. Будзь неспакойным, нездаволеным сабой, пішы яшчэ больш глыбока і праўдзіва, працуй, каб людзям было радасна лічыць твой ураджай—сваім.

Мы яшчэ, дружа, паходзім басанож па церпкіх росах над Нёманам і Дняпром, мы яшчэ паспрачаемся, паспяваем і парагочам!..

Янка БРЫЛЬ.



В. Казачэнка і М. Лынькоў на возеры Нарач.

КУЗНЯ ЭСТЭТЫЧНЫХ ВЕДАЎ

Калі ідзеш сюды, мімаволі ўспамінаецца юнацтва, школа, залатая пара вучобы, гарачыя дні спрэчак, пошукаў. Па-студэнцку ўзбягаеш па каменных усходках Дома партыйнай асветы, дзе павінны быць чарговыя заняткі ўніверсітэта мастацтва, і сядаеш за стол, як некалі за парту.

У прасторнай зале — дзеячы мастацтва. Амаль заўсёды тут прысутнічаюць народныя артысты рэспублікі—Л. Бражнік, Г. Абуховіч, Я. Палосін, Я. Карнаухаў, заслужаныя артысты—А. Шах-Парон, І. Ражба, Ул. Говар-Бандарэнка, мастакі, кампазітары, артысты Дзяржаўнага рускага тэатра імя М. Горкага, Тэатра юнага гледача, Вялікага тэатра оперы і балета, Тэатра лялек, філармоніі і многія іншыя. Купалаўцаў не відаць, бо ў іх ёсць свой універсітэт, «акадэмічны».

На заняткі сюды прыходзіць звычайна 150—200 чалавек. Гэта пераважна людзі пажылыя; моладзь, відаць, лічыць, што ёй хапае інстытуцкіх ведаў. А дарма! У наш час кожны дзень прыносіць мастацтву нешта новае, і жыць, не ўзбагачаючыся штодзённа ведамі, — значыць безнадзейна адставаць альбо, у лепшым выпадку, таптацца на месцы.

Даўно мінуў той час, калі акцёр лічыў, што з яго хопіць мець толькі талент. «Трэба іграць, а тэкст ролі падкажа суфлёр», — гаварыў які-небудзь правінцыяльны комік з дарэвалюцыйнай антрэпрызы. У прыгонным тэатры акцёры наогул вучылі свае ролі на слых, з чужых слоў, бо былі непісьменнымі. Але ж у сучасным савецкім тэатры, дзе вырашаюцца складаныя ідэйна-мастацкія задачы, немагчыма нават уявіць сабе акцёра, не ўзброенага ведамі як палітычнымі, філасофскімі, так і з галіны марксісцка-ленінскай эстэтыкі. Вывучэнне жыцця, чалавечай псіхалогіі не можа быць плённым без належнай эрудыцыі.

Тэматычны план лекцый універсітэта мастацтва Беларускага тэатральнага таварыства складзены з такім разлікам, каб у яго ўвайшлі найбольш актуальныя і надзённыя тэмы. Заняткі універсітэта адбываюцца два разы ў месяц. З пачатку навучальнага года яго наведвальнікі праслухалі ўжо шмат лекцый, у тым ліку: «XXII з'езд КПСС і эстэтычнае выхаванне працоўных», «Партыйнасць мастацтва», «Асновы і заканамернасці мастацкай творчасці», дзве лекцыі аб праблемах сучаснага канфлікту ў літаратуры і мастацтве. Адбылася цікавая сустрэча слухачоў універсітэта з рэжысёрам МХАТ, заслужаным дзеячом мастацтва РСФСР і БССР І. Раеўскім, прысвечаная юбілею К. Станіслаўскага. Вядомы рэжысёр прачытаў даклад «Станіслаўскі і сучасны тэатр», пасля якога слухачы абмяняліся думкамі аб ролі і значэнні рускага тэатральнага рэалізму ў развіцці беларускага тэатра. Аб уплыве вялікага рэфарматара рускай сцэны К. Станіслаўскага і МХАТа на Акадэмічны тэатр імя Янкі Купалы і Тэатр імя Я. Коласа шырока гаварылася на рэспубліканскай навуковай канферэнцыі дзеячоў тэатраў БССР у дні юбілею К. Станіслаўскага.

Мне давялося аб'ездзіць многа краін Заходняй Еўропы, пазнаёміцца з дзейнасцю як драматычных, так і музычных тэатраў, але я нідзе не бачыў такой прагі да вучобы, як у Савецкім Саюзе. Я маю на ўвазе, што універсітэты культуры існуюць не толькі для дзеячоў мастацтва, але і для шырокіх працоўных мас, якія з ахвотаю ідуць туды ў свой вольны час. Гэта цудоўна, калі чалавек не старэе, не аглядаецца на пражытыя гады, а імкнецца да ведаў, культуры, выхоўвае свой эстэтычны густ.

Сёння ў рэспубліцы больш за сто народных універсітэтаў культуры. Лекцыі ў іх чытаюць пераважна самі дзеячы культуры і мастацтва — рэжысёры, кампазітары, мастакі, вядучыя акцёры тэатраў і канцэртных арганізацый. Гэтыя лекцыі і творчыя справаздачы майстроў мастацтва збіраюць шматлікую аўдыторыю, яны суправаджаюцца паказам урыўкаў са спектакляў, канцэртамі, дэманстрацыяй кінафільмаў, адпаведных тэматыцы лекцый і дакладаў. Гэта робіць матэрыял лекцыі больш цікавым, а атрыманыя веды больш глыбокімі.

У Тэатры юнага гледача рэгулярна праводзяцца заняткі з навучэнцамі прафесіянальна-тэхнічных вучылішчаў. Галоўны рэжысёр тэатра Б. Дакутовіч, заслужаны дзеяч мастацтва БССР Ул. Стэльмах знаёмяць слухачоў з тым, што такое тэатр, раяць ім, як глядзець спектакль, расказваюць пра класічную і сучасную драматургію. А пасля лекцыі, звычайна, паказваецца спектакль тэатра.

Праз радыё і тэлебачанне музыка ўвайшла ў кожны наш дом. Цяпер цяжка дастаць білет на канцэрты вядомых артыстаў або сімфанічных і эстрадных аркестраў.

Вялікім поспехам карыстаюцца музычныя універсітэты для дарослых. Цікавая, у гэтым сэнсе, гісторыя Пінскага універсітэта аматараў музыкі. У старажытным беларускім горадзе некалькі гадоў назад быў адкрыты універсітэт культуры з музычным факультэтам. Але ахвотнікаў займацца на музычным факультэце набралася столькі, што давялося стварыць самастойны універсітэт музычнай культуры. Сёлета яго слухачы заканчваюць трохгадовую праграму заняткаў.

Трэба адзначыць, што музычным выхаваннем працоўных, апроч Дзяржаўнай філармоніі, займаюцца і Саюз кампазітараў БССР. Дзяржаўная харавая капэла і асабіста яе мастацкі кіраўнік народны артыст Савецкага Саюза Р. Шырма, Дзяржаўны ансамбль песні і танца, Дзяржаўны аркестр народных інструментаў і іх мастацкія кіраўнікі народныя артысты рэспублікі Г. Цітовіч і І. Жыновіч.

Сёлета ў дапамогу музычным універсітэтам культуры складаецца фанатэка, набыта звыш тысячы выдатных твораў рускай класічнай, савецкай і замежнай музыкі ў грамзапісе і на магнітафонных стужках.

Нашы дзеячы мастацтва лічаць сваім ганаровым абавязкам прымаць самы жывы ўдзел ва ўсенародным руху да культуры і ведаў, якім ахоплены ўсе пакаленні савецкіх людзей. «Мы жывём у перыяд вострай ідэйнай барацьбы, у перыяд барацьбы за розумы, за перавыхаванне людзей, — гаварыў М. С. Хрушчоў на сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва. — Гэта складаны працэс, значна больш цяжкі, чым перароблка станкоў і заводаў. Вы—дзеячы літаратуры і мастацтва, — вобразна кажучы, — кавалі па перакоўцы псіхалогіі людзей. Вы маеце моцную зброю, і гэта ваша зброя заўсёды павінна дзейнічаць у інтарэсах народа».

Камуністычная партыя і савецкі ўрад стварылі ўсе неабходныя ўмовы, каб кожны савецкі чалавек меў магчымасць вучыцца, павышаць сваю культуру і веды. У народных універсітэтаў ёсць свае памяшканні, неабходная апаратура, наглядныя дапаможнікі. Масавымі тыражамі выходзіць адпаведная літаратура, публікуюцца бібліяграфічныя даведнікі, плакаты і розныя дапаможнікі для лектараў і слухачоў. Ужо не кажучы пра выданні розных брашур, праграм і вучэбных планаў цэнтральных выдавецтваў, Дзяржаўнае выдавецтва БССР сёлета выдае каля 25 новых кніг і брашур па пытаннях эстэтыкі тэатра, музыкі, выяўленчага мастацтва. Мінская кінастудыя навукова-папулярных і хранікальна-дакументальных фільмаў, якая летась выпусціла 17 кароткаметражных нарысаў у дапамогу універсітэтам культуры, сёлета значна павялічвае колькасць гэтых выпускаў. Усяго ж у рэспубліканскай фільматэцы — звыш паўтары тысячы кароткаметражных фільмаў пра музыку, літаратуру, архітэктуру, выяўленчае і тэатральнае мастацтва. Апрача таго, сёлета нашы універсітэты культуры атрымаюць звыш паўтысячы каляровых дыяфільмаў, якія таксама памогуць прапагандаваць мастацтва. Справа цяпер, відаць, у тым, каб нашы універсітэты культуры ўмела карысталіся гэтым скарбам.

Вялікае значэнне ў выхаванні эстэтычнага густу народа маюць перасоўныя выстаўкі выяўленчага мастацтва. Саюз мастакоў БССР разам з Дзяржаўным мастацкім музеем накіроўвае ва універсітэты культуры перасоўныя выстаўкі лепшых твораў савецкага выяўленчага мастацтва. Яны вандруюць па ўсёй рэспубліцы: з горада ў горад, з вёскі ў вёску. Экспазіцыі гэтых выставак суправаджаюць кваліфікаваныя лектары і экскурсаводы. Мастацкі музей штогод папаўняецца новымі творамі беларускіх мастакоў, праводзіць выстаўкі ўсесаюзных фондаў выяўленчага мастацтва, сістэматычна набывае і экспануе выдатныя творы рускага класічнага мастацтва, творы лепшых майстроў савецкага жывапісу і скульптуры. А хіба ж добра арганізаванае наведванне мастацкага музея не з'яўляецца нагляднай школай эстэтычнага густу?

Агульнавядома, якое вялікае значэнне ў жыцці культурнага чалавека мае кніга. Аднак чытаць яе трэба ўмець. Пачэсны абавязак нашых бібліятэк—навучыць гэтаму слухачоў універсітэтаў культуры, забяспечыць іх бібліяграфічнымі даведнікамі, арганізаваць кніжныя выстаўкі і г. д. Многае ў гэтай справе робіць Дзяржаўная бібліятэка імя Ул. І. Леніна, а таксама некаторыя гарадскія і раённыя бібліятэкі.

«Кнігай для ўсіх» называюць у нас радыё і тэлебачанне. Іх значэнне ў дзейнасці універсітэтаў культуры надзвычай вялікае. У час, калі працуе радыёуніверсітэт культуры (а ён дзейнічае чатыры разы на тыдзень і мае два факультэты—літаратурны і музычны), да радыёкропак з алоўкамі і сшыткамі збіраюцца слухачы і ўважліва слухаюць перадачы, занатоўваючы найбольш важнае і цікавае.

Мінская студыя тэлебачання арганізавала на грамадскіх асновах тэлевізійны універсітэт навукі і культуры. Яго рэгулярныя перадачы — лекцыі па пытаннях літаратуры, мастацтва і навукі, багата ілюстраваныя, прыцягваюць увагу многіх працоўных. Удзельнічаюць у гэтых перадачах вядомыя дзеячы культуры, пісьменнікі, вучоныя, дзеячы мастацтва.

Пакуль што слаба памагаюць народным універсітэтам нашы навучальныя і навуковыя ўстановы: Беларуская дзяржаўная кансерваторыя, тэатральна-мастацкі інстытут, а таксама Акадэмія навук БССР, яе інстытуты. Ва ўсіх жа гэтых установах хапае навуковых сіл, каб забяспечыць універсітэты культуры вопытнымі выкладчыкамі гуманітарных дысцыплін.

Нашы народныя універсітэты закліканы памагчы савецкім людзям раскрыць свет прыгожага, навучыць любіць і разумець яго. У іх рабоце ёсць і некаторыя заганы, якіх неабходна пазбыцца. Часам універсітэты культуры ствараюцца чыста ведамасным шляхам, або ўзнікаюць стыхійна там, дзе няма неабходных умоў для іх нармальнага існавання: адсутнічаюць адпаведная база і кваліфікаваныя выкладчыкі. У такіх універсітэтах пануе нуда, бязладдзе, няма планаў і праграм, а калі яны і ёсць, дык іх немагчыма выканаць. Такія універсітэты існуюць больш на паперы, а на справе яны хутка перастаюць працаваць і самаліквідуюцца. Ёсць універсітэты, якія з'яўляюцца, па сутнасці, звычайнымі лекторыямі, дзе лекцыі чытаюцца ад выпадку да выпадку.

Мне думаецца, што сёння неабходна больш дбаць аб якасці выхавання слухачоў універсітэтаў, не ганяючыся за іх колькасцю. Гэта асабліва датычыць тых універсітэтаў, у якіх ёсць пэўныя навыкі, вопыт і традыцыі, як, скажам, Гомельскага, які пяты ўжо год паспяхова працуе пры Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна. Трэба арыентавацца іменна на тых слухачоў, якія займаюцца гэтай справай сур'ёзна, імкнуцца выхоўваць свой эстэтычны густ, павышаць культурны ўзровень.

Для таго, каб не скампраментаваць самую ідэю народных універсітэтаў, трэба іх ствараць там, дзе для гэтага ёсць адпаведныя ўмовы: памяшканне, лектары, пэўны кантынгент слухачоў. Перш чым пачынаць заняткі, неабходна мець праграму і добра прадуманы план. А каб вучоба была цікавай і карыснай, неабходна суправаджаць яе паказам кінафільмаў, дыяпазітываў, слуханнем музыкі, арганізоўваць наведванне выставак, спектакляў з абмеркаваннем убачанага разам з дзеячамі мастацтва.

Форм, метадаў выхавання вельмі многа і наўрад ці варта зводзіць іх у нейкую абавязковую інструкцыю. Лепш за ўсё шукаць гэтыя формы на месцы, выходзячы з канкрэтных умоў і ўзроўню развіцця слухачоў. Вядома, больш за ўсё дапамогуць добрай арганізацыі універсітэтаў культуры яго кіраўнікі, калі пазнаёмяцца з работай тых універсітэтаў, у якіх ужо ёсць пэўны станоўчы вопыт.

М. С. Хрушчоў на сустрэчы кіраўнікоў партыі і ўрада з дзеячамі літаратуры і мастацтва 8 сакавіка 1963 г. гаварыў: «Мы жывём у такі час, калі літаратура і мастацтва, як і прадказваў Уладзімір Ільіч Ленін, сталі непарыўнай часткай агульнанароднай справы», і трэба, каб кожны пісьменнік, работнік мастацтва лічыў сваім абавязкам памагчы савецкім людзям—актыўным будаўнікам камунізма—павышаць свае веды, свой культурны ўзровень.

Я. РАМАНОВІЧ.

На рэспубліканскім сходзе актыву творчай інтэлігенцыі. Фота У. КІТАСА.

У ЯГО ТВОРАХ

трыпціху. «Мая рэспубліка»—прыкладна так павінен ён называцца. Ва ўсякім выпадку тэма мастака менавіта такая — мая рэспубліка, маё жыццё, мае мары.

— Гучныя словы не заўсёды выказваюць тое, што ляжыць на сэрцы, — задуменна гаворыць Яўгеній Аляксеевіч. — Але ўсё ж карціна павінна быць гераічнай і ў той жа час лірычнай. Задушэўнасць і героіка, мінулае і цяперашняе мне хочацца пераплесці ў своеасаблівы вобраз-сімвал, які будзе раскрыты ў трох частках трыпціха. Словам, калі будзе гатова работа, прыходзьце ў майстэрню, а пакуль даруйце...

Хвалююць мастака і іншыя тэмы. Адна з іх даўно блізкая аўтару. Гэта тэма арміі. Ёй ён прысвяціў нямала сваіх палотнаў, яшчэ даваенных, як, напрыклад, «Чапаеў» і «Уступленне Чырвонай Арміі ў Мінск», і тых, якія выраслі з карандашных замалёвак у ваенных блакнотах і эцюдаў мінулых гадоў. Яны цяпер знаходзяцца ў шматлікіх музеях краіны і шырока вядомы. Гэта — «Пахаванне героя» і «Парад партызан у Мінску», «Стаяць насмерць» і «Канстанцін Заслонаў», партрэты партызан і воінаў і, нарэшце, вялікая карціна «Абарона Брэсцкай крэпасці».

Дарэчы, Яўгеній Аляксеевіч адзін з першых у выяўленчым мастацтве звярнуўся да тэмы героікі абаронцаў Брэсцкай крэпасці. У першыя ж пасляваенныя гады ён пабываў у крэпасці, аблазіў яе казематы і руіны і загарэўся задумай адлюстраваць у мастацкіх вобразах герояў-абаронцаў. Брэстчане не раз сустракалі дзе-небудзь у ціхім куточку мастака з мальбертам, калі ён рабіў эцюды, замалёўкі, эскізы, занатоўваючы руіны. Некаторыя з іх, як, напрыклад, «Разбураныя Тыраспальскія вароты», «Руіны Белага палаца», напісаны ўсхвалявана, з вялікай перакананальнасцю ўзнаўляюць гістарычныя месцы баёў. Яны з'яўляюцца закончанымі, самастойнымі творамі і таксама знаходзяцца цяпер у музеях рэспублікі.

У час работы мастак пазнаёміўся з непасрэднымі ўдзельнікамі і відавочцамі падзей у крэпасці, пасябраваў з салдатамі, пісаў з іх партрэты, падбіраючы тыпажы для свайго будучага палатна. Карціна «Абарона Брэсцкай крэпасці ў 1941 годзе», якую Я. Зайцаў закончыў у 1950 годзе, з'явілася этапнай работай у творчасці мастака. Як і ў іншых лепшых творах, яго цікавіла тут не толькі сама падзея. Героіку барацьбы ён раскрывае ў жывых чалавечых вобразах, праз псіхалагічны стан сваіх герояў. З вялікай сілай пераканальнасці раскрыў героіку савецкіх людзей у гады Айчыннай вайны аўтар і ў карціне «Стаяць насмерць».

Што ж сёння пацягнула Я. Зайцава зноў да ваеннай тэмы?

Вонкава — падштурхнула выстаўка «На варце міру», якая адкрыецца ў 1965 годзе і будзе прысвечана юбілею Савецкай Арміі. Але гэта толькі вонкава, бо аўтар даўно адчувае сябе ў даўгу перад героямі яго юнацкіх гадоў. Не выпадкова тэму сваёй будучай карціны ён уяўляе ў вобразе грамадзянскай вайны. Вобраз гэты асацыіруецца з памяццю аб бацьку, які загінуў у баях за маладую Савецкую рэспубліку.

— Але гэта не павінна быць проста ўспамінам або ўзнаўленнем гісторыі, — гаворыць Яўгеній Аляксеевіч. — Мне сваю задуму хочацца скіраваць у сёння, праз свае юнацкія ўспаміны звярнуцца да нашага сённяшняга юнацтва і расказаць яму пра доблесць бацькоў.

Яўгенія Аляксеевіча паклікалі на выстаўком і я, перагортваючы запісанае, задумаўся — як жа гэтую кароткую гутарку перадаць так, каб чытач больш поўна ўявіў сабе творчае аблічча мастака. Бо акрамя тых нямногіх работ, якія тут названы, мастаком створана шмат партрэтаў герояў мірнай працы, простых савецкіх людзей. Сярод іх партрэт свінаркі А. І. Чарняўскай ці партрэт калгаснага брыгадзіра П. Н. Кандрацэнкі і шмат іншых. Створаны шматлікія пейзажы — «Лясная дарога», «Дубкі», «Вечар на рацэ Проні», «Бераг Дняпра», «Прыпяць», «На Палессі» і іншыя, у якіх Я. Зайцаў раскрываецца як натхнёны паэт беларускай прыроды. Сакавіты, рэалістычны жывапіс яго нясе ў сабе глыбокія думкі і пачуцці аўтара, які аддае свой талент народу. Але ці варта паўтараць зноў тое, што так добра вядома шматлікім гледачам і аб чым ужо не раз пісалася.

Яшчэ ў 1944 годзе, у дзень 25-годдзя Беларускай ССР, Я. Зайцаву было прысвоена званне заслужанага дзеяча мастацтва БССР. Цяпер мастаку, які прызнаны адным з вядучых майстроў беларускага жывапісу, прысвоена званне народнага мастака БССР.

А. СУРСКІ.

РЭПЛІКА

«ГАЎРОШ» НА КАНВЕЕРЫ

Мінская галантарэйна-мастацкая фабрыка «Белмастакпрамгандлю» выпускае ляльку для дашкольнікаў «Гаўрош».

Цяжка зразумець, чаму з мноства герояў літаратурных твораў выбраны менавіта гэты. Тым больш для дашкольнікаў. Але калі б той «Гаўрош» быў хоць падобны да свайго французскага сабрата...

Складаная праблема стаяла, пэўна, перад работнікамі фабрыкі. Сапраўды, як і ў што апрануць «Гаўроша»? Калі быць дакладнымі, трэба шыць ледзь не лахманы. А хто купіць такую ляльку? Вырашылі зрабіць «Гаўрошу» касцюм клоўна. А каб не адысці ад праўды, валасы на галаве крыху ўскудлачылі — усё ж «дзіця вуліцы».

У такім выглядзе «Гаўрош» трапіў у гандлёвую сетку.

Самае дзіўнае, што на гэта ёсць дазвол мастацка-тэхнічнага камітэта па цацках пры Міністэрстве асветы БССР. Выданы ён у красавіку 1962 года. З таго часу і гуляе «Гаўрош» па паліцах.

Работнікі фабрыкі згаджаюцца, што лялька атрымалася няўдалай. Але нічога, маўляў, не зробіш: канвеер запушчаны.

Можа, нейкім выйсцем было б перайменаваць лялькі, што засталіся ў магазінах. Але зрабіць гэта, аказваецца, больш складана, чым змяніць прозвішча жывому чалавеку. Трэба склікаць той самы камітэт, мастацкі савет і паважным людзям, у тым ліку кіраўнікам фабрыкі, распісацца ва ўласных памылках...

— Не, мы ўжо лепш зробім новую ляльку, — кажуць на галантарэйна-мастацкай.

А «Гаўрош» тым часам на канвееры.

М. КОЎСКІ.



Новая кнігарня адкрылася нядаўна ў Віцебску на праспекце імя Фрунзе. У прасторным, светлым памяшканні вялікі выбар мастацкай, палітычнай і тэхнічнай літаратуры.

Фота М. МІНКОВІЧА.

ЗАГАДКА П. К.

Мой бацька працуе будаўніком у калгасе. Ён часта пасылае свае допісы, вершы ў раённую газету. Селькораўскі стаж у бацькі вялікі. Пачаўся ён яшчэ тады, калі Заходняя Беларусь знаходзілася пад уладай польскіх паноў. Бацька вельмі ганарыцца тым, што друкаваў тады на старонках прагрэсіўных беларускіх газет вершы рэвалюцыйнага характару, хаця, магчыма, яны былі далёка недасканалыя па форме.

Заўсёды, калі я прыязджаю дадому, мы расказваем адзін аднаму пра свае поспехі і няўдачы на «літаратурнай ніве», дзелімся навінамі.

На гэты раз ён паказаў мне кніжку «Беларускі фальклор Вялікай Айчыннай вайны», якую атрымаў у падарунак ад рэдакцыі міжраённай газеты як лепшы штатны карэспандэнт.

— Можа тут і твае вершы ёсць, — пацікавіўся я.

— Мае не трапілі, а адзін верш Клінава ёсць. Вось, пачытай...

Мы чуем вас,
Сыны вялікага народа,
Бо кожны дзень і кожны час
Грымоты блізяцца з Усходу.

З зямлі вялікай з вольным ветрам
Ваш заклік даляцеў да нас,
І сэрцы нашы ім сагрэты.
Мы чуем вас!

Аб слаўных ратных справах вашых
Пяўцы складаюць песню-сказ,
Мацней забіліся сэрцы нашы,
Бо чуем вас.

У бой вядзе нас гнеў народны,
І блізак той чаканы час:
Зноў будзе Беларусь свабоднай!
Мы стрэнем вас.

Пакуль струменіць кроў у жылах,
Пакуль жыцця агонь не згас,
Мы будзем біць фашыстаў з тылу,
Мы чуем вас!

На ваш зварот, браты-героі,
— Смерць акупантам! — наш адказ:
— У бой з фашысткаю ардою!
Браты! Мы чуем вас!

— Чаму ты думаеш, што гэта верш Клінава. — пытаюся ў бацькі, — тут жа няма подпісу...

— А ты паглядзі ў каментарыях...

Перагортваю старонкі.

— Вось, — бацька паказвае на адзначанае алоўкам месца. Чытаю: «Подпіс пад вершам партызана П. К. з газеты «Прымежны калгаснік», орган Ушацкага РК КПБ(б)Б, 1943».

— Яшчэ невядома, хто такі гэты партызан П. К., — зазначаю я.

— Пётр Клінаў, — упэўнена адказвае бацька. — Старшыня нашага сельсавета.

— А чаму поўнасцю не напісалі яго прозвішча?

Тады стары, пакрыўджаны маёй недаверлівасцю, моўчкі ўздзеў на нос акуляры, знайшоў 42 старонку і зноў падаў кніжку мне. У прадмове прыводзіцца гэты ж самы верш. Я зноў натыкаюся на загадкавыя літары П. К. Ага, унізе ёсць тлумачэнне: «Прозвішча аўтара таксама не ўдалося расшыфраваць.»

— Мабыць і не ён.

— Калі я кажу, то ведаю. Клінаў мне сам казаў, што верш яго. «Трэба схадзіць да Клінава, гэта не так далёка, — рашыў я. Там і даведаюся аб усім падрабязна».

І вось я ў Клінава. Чалавек гэты з першага погляду здаецца занадта сур'ёзным і строгім, але гэта — толькі першае ўражанне. У куточках вуснаў і крыху прыжмураных вачах яго хаваецца дабрадушная цёплая ўсмешка.

Скупаваты на слова, Акімыч пра сябе расказвае мала.

— Верш сапраўды напісаў я, — адказаў ён на маё пытанне, — а ініцыялы паставіў таму, што немцы, дазнаўшыся, маглі б забіць маці і сястру, якія заставаліся дома. Мы ў газеце, калі пісалі аб партызанах, таксама не ўказвалі поўнасцю іх прозвішчаў. А вёску нашу немцы ўсё ж спалілі і Сцяпана, брата майго, расстралялі.

— А вы працавалі ў газеце?

— Спачатку быў у атрадзе, а потым мяне перавялі ў рэдакцыю.

Ён падышоў да этажэркі і вярнуўся да стала, несучы ў руках пажоўклую і працёртую газету.

— Вось яна, наша партызанская. Мне самому часта прыходзілася збіраць факты для яе. Быў адначасова і разведчыкам і карэспандэнтам.

Клінаў закурыў, крышку памаўчаў, потым зноў працягваў свой расказ.

— Верш «Мы чуем вас!» я напісаў у адказ на зварот беларусаў, якія змагаліся на фронце. Нам, партызанам, гэты зварот прынёс вялікую радасць. Мне хацелася выказаць сваё пачуццё, якое перапаўняла сэрца.

І ён зноў замоўк на хвіліну, быццам засаромеўся гэтых усхваляваных слоў.

— Пятро Акімавіч, а больш вы не пісалі вершаў?

— Чаму не пісаў? У газеце «Кліч партызана» быў надрукаваны верш «Партызан Кошка»... І яшчэ былі, усіх не памятаю.

— А вось тут у кнізе ёсць верш партызана Пятра К. Мабыць, таксама ваш?

Клінаў зазірнуў у кніжку і адмоўна пакруціў галавой.

— А гэты, «Гарыць шырэй святая помста», майго брата Івана. Тут і подпіс стаіць І. Клінаў. Ён таксама быў партызанам. Зараз працуе старшынёй калгаса ў Брэсцкай вобласці...

... Газета «Кліч партызана» выходзіла ў нашым раёне. Па загадзе штаба партызанскага руху быў створаны атрад і накіраваны ў Мёрскі раён. Хутка на базе яго была створана брыгада. Нам прыслалі друкарню і мы пачалі выпускаць «Кліч партызана». Друкарня была не такая, якою прывыклі ўяўляць яе. Яна складалася з брызентавай торбы з наборнымі касамі ды машынкі з ручкай, круцячы якую можна было адціскаць нумары газеты і лістоўкі...

Голас былога партызана гучыць спакойна, але ў ім адчуваецца смутак па сябрах, што загінулі, і суровы прысуд вайне.

Калі я вярнуўся дадому, бацька яшчэ сядзеў ля стала і нешта пісаў.

— Ну як, пераканаўся, хто такі П. К.?

— Так. І паспрабую расказаць пра гэта...

П. СУШКО,
студэнт аддзялення журналістыкі філалагічнага факультэта БДУ.

Літаратура і Мастацтва

Кансультацыя

У рэдакцыю звярнуліся слухачы універсітэта мастацкага выхавання пры Гомельскім Палацы культуры чыгуначнікаў імя Ул. І. Леніна: брыгадзір брыгады камуністычнай працы майстар аўтакантрольнага пункта вагоннага дэпо Пётр Сіроткін, касір пасажырскага вакзала Алена Мядзведзева і слухач школы мастацкага выхавання пры гэтым Палацы вучань 28-й сярэдняй школы Юрый Тартакоўскі з просьбай парэкамендаваць ім літаратуру, якая б выкрывала антыграмадскую і антыэстэтычную сутнасць сучаснага буржуазнага мастацтва. Чытачам газеты адказвае загадчык сектара мастацтва Дзяржаўнай бібліятэкі БССР імя Ул. І. Леніна В. Н. Дышыневіч.

Па ўсёй нашай краіне цяпер абмяркоўваюцца пытанні развіцця савецкага мастацтва, яго сувязі з жыццём народа, яго вялікай ролі ў камуністычным выхаванні працоўных. Высока ацэньваючы дасягненні мастацтва сацыялістычнага рэалізму, партыя рашуча асуджае ўсялякія праяўленні фармалізму, абстракцыянізму і іншых антынародных плыней у мастацтве, як вынік уплыву чужой нам ідэалогіі, як перайманне ўнадніцкага буржуазнага мастацтва. Аб рэакцыйнай сутнасці і ідэалістычных філасофскіх асновах буржуазнага мастацтва напісана многа кніг і брашур. У гэтай літаратуры асвятляюцца пытанні марксісцка - ленінскай эстэтыкі і філасофіі, палітыка Камуністычнай партыі Савецкага Саюза ў галіне літаратуры і мастацтва. Рэкамендуецца прачытаць наступныя кнігі і артыкулы:

Маркс, Энгельс, Ленін аб мастацтве. М., «Сав. Расія», 1957.

Ленін Ул. І. Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм. Творы, т. 14.

Ленін Ул. І. Філасофскія сшыткі. Творы, т. 38.

Ленін Ул. І. аб літаратуры і мастацтве. М., Дзяржпалітвыдат, 1957.

Аб літаратуры і мастацтве. Зборнік дакументаў. М., «Сав. Расія», 1960.

Матэрыялы XXII з'езда КПСС. М., Дзяржпалітвыдат, 1961.

Хрушчоў М. С. За цесную сувязь літаратуры і мастацтва з жыццём народа. М., Дзяржпалітвыдат, 1957.

Хрушчоў М. С. Высокая ідэйнасць і мастацкае майстэрства — вялікая сіла савецкай літаратуры і мастацтва. М., Дзяржпалітвыдат, 1963.

Ільічоў Л. Ф. Мастацтва належыць народу. М., Дзяржпалітвыдат, 1963.

Асновы марксісцка - ленінскай эстэтыкі. М., Дзяржпалітвыдат, 1960.

Сакалоў В. С. Марксізм-ленінізм аб мастацтве. М., «Знание», 1961.

Пляханаў Г. В. Пралетарскі рух і буржуазнае мастацтва. (У кнізе «Мастацтва і літаратура», М., 1948).

Горкі М. Разбурэнне асобы. Творы, т. 24.

Ягораў А. Аб рэакцыйнай сутнасці сучаснай буржуазнай эстэтыкі. М., Дзяржлітвыдат, 1961.

Мажнячун С. Абстракцыянізм — разбурэнне эстэтыкі. М., «Соцэкгіз», 1961.

Пракоф'еў В. Н. Крытыка «тэарэтычных» асноў абстракцыянізму. (У кнізе «Сучаснае выяўленчае мастацтва капіталістычных краін», М., «Сов. художник», 1961, стар. 9—44).

Пракоф'еў В. Н. Абстракцыянізм і яго гістарычная «місія». (У кнізе «Супраць рэвізіянізму ў мастацтве і мастацтвазнаўстве», М., «Искусство», 1959, стар. 124—148).

Апрэсян З. Капіталізм варожы мастацтву. Часопіс «Молодой коммунист», 1962, № 3.

Лебедзеў А. К. Мастацтва ў ланцугах: (Крытыка навейшых плыняў у сучасным буржуазным выяўленчым мастацтве) М., «Изогиз», 1962.

Лебедзеў А. К. Супраць абстракцыянізму ў мастацтве. Другое выданне. М., Выд. Акадэміі мастацтваў СССР, 1961.

Кібрык Е. Абстрактнае мастацтва. (У кнізе «Аб мастацтве і мастаках», М., Выд. Акадэміі мастацтваў СССР, 1961, стар. 291—304).

Піменаў Ю. Мастацтва жыцця ці мастацтва «нічога». М., «Искусство», 1960.

Мастак і сучаснасць. Штогоднік Акадэміі мастацтваў СССР. М., 1960.

Чагадаеў А. Д. Мастацтва ЗША. М., «Искусство», 1960.

Чуйкоў С. Пра абстракцыянізм і іншыя «ізмы». (У кнізе «Нататкі мастака». М., Выдавецтва «Молодая гвардия», 1962, стар. 96—103).

Глазуноў І. Клякса і вобраз. У часопісе «Молодая гвардия», 1960, № 1.

Калпінскі Ю., Калошын Ф. Што ўяўляе сабой абстракцыянізм у мастацтве. Часопіс «Коммунист», 1959, № 10.

Нямцоў В. Нашчадкі «голага караля». Часопіс «Молодая гвардия», 1960, № 9.

Пракоф'еў В. Н. Што такое сюррэалізм. Часопіс «Творчество», 1959, № 7.

Малдаўскі Д. Мастацтва, якое ўводзіць ад жыцця. Часопіс «Звезда», 1962, № 8.

Кулікова І. С. Сацыяльная сутнасць сюррэалізму. Часопіс «Вопросы философии», 1960, № 8.

Кандратаў А. Ад нуля да нуля. Часопіс «Художник», 1961, № 12.

Мазалеўскі І. Колькі каштуе мастацтва. Часопіс «Художник», 1961, № 10.

Уладзімір СУРЫН,
Генеральны дырэктар кінастудыі «Масфільм».

НА ГАЛОЎНАЙ КІНАФАБРЫЦЫ КРАІНЫ

Важнай асаблівасцю сёлетняга стану мастацкай кінематаграфіі з'яўляецца рашучы паварот дзеячоў кіно да сучаснай тэмы. Нашы сцэнарысты і рэжысёры ўсё смялей і больш упэўнена падыходзяць да шырокага адлюстравання ў кіно сучаснага жыцця, да тых важных і складаных працэсаў, што адбываюцца ў нашым грамадстве.

Перад намі стаіць і іншая, не менш важная задача — задача больш глыбокага і дасціпнага пранікнення мастака ў жыццёвыя працэсы, больш яркага ўвасаблення на экране вобраза чалавека новай эпохі. Мастакі бачаць сваю ролю ў тым, каб ствараць такія творы, якія прынеслі б гледачу радасць і натхненне, такія вобразы і характары, якія валодалі б вялікай сілай маральнага прыкладу.

І яшчэ адна рыса ў мастацкай кінематаграфіі цяперашняга перыяду, якая магла б па праву быць самай галоўнай рысай, — гэта прыход у кіно вялікага атрада таленавітай моладзі.

Гледачы ўсё часцей сустракаюць новыя, дагэтуль невядомыя імёны маладых рэжысёраў, сцэнарыстаў, аператараў, акцёраў, мастакоў, кампазітараў, якія праяўляюць сябе сталымі мастакамі і сталі ў адзін рад са славутымі майстрамі старэйшага пакалення.

«Масфільм» — гэта буйнейшая кінафабрыка краіны, якая выпускае да сарака фільмаў у год. Давайце перагартаем план 1963 года, паглядзім, над чым працуе яе вялікі калектыў сцэнарыстаў, рэжысёраў, аператараў, акцёраў.

Сучаснай тэме па праву належыць цяпер вядучае месца. Рэжысёры і сцэнарысты імкнуцца глыбей і больш паўнакроўна паказаць жыццё рабочых, калгаснага сялянства, людзей навукі, студэнцтва.

Вялікае месца аддаецца стварэнню карцін на гісторыка-партыйныя тэмы, якія расказваюць пра незабыўныя дні рэвалюцыі і барацьбы за ўладу Саветаў.

Працягваецца работа па стварэнню на экране вобраза Уладзіміра Ільіча Леніна і яго бліжэйшых саратнікаў.

Над вялікім кінапалатном пра Леніна працуе рэжысёр Сяргей Юткевіч. Фільм раскажа пра жыццё і дзейнасць Уладзіміра Ільіча ў перыяд яго знаходжання ў польскім мястэчку Пароніна ў 1913—14 гг. Сцэнарый напісан Яўгеніем Габрыловічам. Фільм будзе ставіцца ў садружнасці з польскімі кінематаграфістамі.

Важнае месца ў нашых планах мы аддаём экранізацыі чайбольш значных літаратурных твораў, апублікаваных у апошнія гады. Так, напрыклад, рэжысёр Уладзімір Пятроў прыступіў да здымкаў вялікага двухсерыйнага фільма па вядомым рамане Леаніда Ляонава «Рускі лес».

Ужо доўгі час рэжысёр Рыгор Рашаль працуе з пісьменніцай Галінай Серабраковай, аўтарам вядомых кніг пра Карла Маркса, над сцэнарыем аб жыцці вялікага мысліцеля.

Юлія Сонцава, чый апошні фільм «Аповесць палымяных гадоў» меў заслужаны поспех, прыступае цяпер да экранізацыі аднаго з найбольш цікавых сцэнарыяў нябожчыка рэжысёра Аляксандра Даўжэнкі «Зачараваная Дзясна».

Малады рэжысёр Уладзімір Чабатароў ставіць фільм па раману Усевалада Кочатава «Сакратар абкома».

Адной з вялікіх і важных карцін, якія адлюстроўваюць падзеі першых месяцаў Вялікай Айчыннай вайны, стойкасць і мужнасць савецкага чалавека, з'явіцца фільм «Жывыя і мёртвыя» па раману Канстанціна Сіманава. Ставіць яго рэжысёр Аляксандр Столпер.

Людзям калгаснай вёскі, іх працоўным справам прысвячаецца карціна «Калгас «Зара» па сцэнарыі пісьменніка Юрыя Нагібіна. Ставіць фільм малады рэжысёр Аляксей Салтыкоў, якога глядач ужо добра ведае па фільмах «Сябра мой, Колька» і «Бі, барабан».

Заканчваецца фільм па матывах вядомай п'есы Усевалада Вішнеўскага «Аптымістычная трагедыя». Ён расказвае пра барацьбу маракоў за маладую Савецкую ўладу ў першыя гады рэвалюцыі. Гэты шырокафарматны чорна-белы фільм ставіць рэжысёр Самсон Самсонаў. Карціну здымае адзін з таленавітых нашых аператараў, лаўрэат Ленінскай прэміі Уладзімір Манахаў.

Рэжысёр Васіль Ардынскі прыступае да работы над фільмам пра нашых сучаснікаў па сцэнарыі Георгія Владзімава на матэрыяле яго аповесці «Вялікая руда». Гэтая кніга выклікала вялікую цікавасць і палюбілася нашаму чытачу. Фільм задуманы якраз пра людзей, якія пачынаюць асваенне буйнейшых залежаў жалезнай руды ў раёне Курскай магнітнай анамаліі. Героі фільма — вадзіцелі самазвалаў, машыністы экскаватараў, разведчыкі нетраў.

Па раману Юрыя Бондарава «Цішыня» ставіць вялікую двухсерыйную карціну рэжысёр Уладзімір Басаў. Фільм закранае важныя і вострыя праблемы сучаснасці.

Працягваючы традыцыі садружнасці савецкіх кінематаграфістаў з зарубежнымі кінаарганізацыямі, «Масфільм» ажыццяўляе сёлета некалькі сумесных пастановак.

Пад Масквой у заснежаных палях праводзяцца здымкі першых эпізодаў фільма «Яны ішлі на Усход», пастаноўку якога ажыццяўляе італьянскі рэжысёр Джузепе дэ Санціс. Ён раскажа пра бясслаўны паход італьянскіх салдат, саюзнікаў гітлераўскай Германіі, у Расію ў дні мінулай вайны.

Сёлета мы ажыццёвім сумесную пастаноўку з кубінскімі кінематаграфістамі. Міхаіл Калатозаў хутка прыступіць да здымкаў фільма «Я — Куба», які расказвае пра барацьбу кубінскага народа за сваю свабоду, незалежнасць, за сацыялізм. Фільм пакажа гераічную барацьбу на востраве Свабоды. Здымаць будзе гэты фільм адзін з буйнейшых савецкіх аператараў Сяргей Урусеўскі. Сцэнарый фільма напісаў паэт Яўгеній Еўтушэнка ў садружнасці з кубінскім калегам Эрнестам Барнетам.

У плане «Масфільма» можна знайсці і музычныя фільмы, і кінакамедыі, а таксама карціны для дзяцей і юнацтва. Для гэтага на студыі створана спецыяльнае творчае аб'яднанне дзіцячых і юнацкіх фільмаў.

Ёсць усе падставы лічыць, што 1963 год на «Масфільме» будзе годам плённым, таму што калектыў цяпер працуе над вялікай і разнастайнай па тэматыцы і жанрах творчай праграмай.

АДН.

ЗША, раскідваючы па свеце свае ядзерныя базы, накіраваныя супраць сацыялістычных краін, фактычна прыносяць у ахвяру саюзныя і залежныя ад іх краіны.

З газет.

Шашлык... па-амерыканску.

Мал. Ул. БАРАНОЎСКАГА.

НОВЫЯ ПЕРАКЛАДЫ

«Драугістэ» («Дружба») — так называецца новая серыя рэпертуарных зборнікаў для мастацкай самадзейнасці, якія сёлета пачаў выдаваць Дом народнага мастацтва Літоўскай ССР. Першую кнігу, якая выйшла пад такой назвай, складала творчасць аўтараў Расійскай федэрацыі. Днямі выйшла другая кніжка «Драугістэ». Яе падзагаловак гаворыць «Зборнік для мастацкай самадзейнасці з творчасці аўтараў Беларускай ССР».

Уступны артыкул складальніка — рэжысёра-кансультанта Беларускага рэспубліканскага Дома народнай творчасці С. Гурыч расказвае літоўскім чытачам пра лепшыя самадзейныя калектывы Беларусі.

Зборнік складаецца з частак — паэзіі, прозы, драмы, харэаграфіі, музыкі. У раздзеле паэзіі прадстаўлены вершы М. Танка, А. Куляшова, А. Звонака, М. Калачынскага, К. Крапівы і іншых. З прозы тут змешчаны апавяданні «Дзед Аўсей і Палашка» М. Лынькова, «Любімы горад» С. Гурыч, а таксама камедыя «З хворай галавы на здаровую» Э. Валасевіча. Вершы, прозу і драму пераклаў вядомы літоўскі паэт Альбінас Жукаўскас.

Літоўскія танцоры могуць развучыць беларускую польку і Смаргонскую кадрылю, якія ў зборніку дадзены ў падрабязным апісанні і перакладзе К. Пашкайціса.

Для аматараў спявання ў зборніку змешчаны песні Я. Цікоцкага, Р. Пукста, А. Шыдлоўскага, Ю. Семяякі, якія на літоўскую мову пераклаў Н. Навіцкас.

Новы выпуск «Драугістэ» з'явіцца добрым падарункам беларускіх сяброў літоўскім самадзейным калектывам.

С. ЛІРАВА.

МЕМАРЫЯЛЬНАЯ ВЫСТАЎКА АРМЯНСКІХ ПІСЬМЕННІКАЎ

У самым цэнтры Ерэвана знаходзіцца музей літаратуры і мастацтва Акадэміі навук Армянскай ССР, у якім нядаўна адкрылася пастаянная мемарыяльная выстаўка армянскіх пісьменнікаў.

Тут паказана адно стагоддзе шматвяковай гісторыі армянскай літаратуры. Успомнена некалькі дзесяткаў імёнаў — ад пачынальніка новай армянскай літаратуры Хачатура Абаяна (сярэдзіна XIX стагоддзя), шматпакутнага аўтара рамана «Раны Арменіі», да Егіша Чарэнца, буйнейшага савецкага паэта, які стаў ахвярай неабгрунтаваных рэпрэсій у перыяд культу асобы. Кнігі, рукапісы, дакументы...

На выстаўцы шырока прадстаўлены першыя выданні твораў лепшых армянскіх пісьменнікаў, іх скульптурныя і мастацкія партрэты, куткі рабочых кабінетаў, рэчы асабістага ўжытку. І кожны, хто прыходзіць сюды, нібы нанава адчувае духоўнае аблічча выдатных дзеячоў армянскай культуры, далучаецца да хвалюючага свету іх жыцця, да першакрыніц іх творчасці і неўміручых слядоў іх барацьбы. Знаёмячыся, напрыклад, з раздзелам, прысвечаным Мікаэлу Налбандзяну, нельга прайсці міма рукапісу верша «Свабода», не паглядзець на фотакопіі яго перакладаў на пяць еўрапейскіх моваў і фатаграфіі камеры Петрапаўлаўскай крэпасці, дзе гэты выдатны літаратар быў зняволены за рэвалюцыйную дзейнасць.

Цікавыя матэрыялы расказваюць пра два напрамкі новай армянскай літаратуры — заходняй і ўсходняй (турэцкай і расійскай), пра мастакоў слова, якія жылі ў выніку гістарычных акалічнасцей далёка адзін ад аднаго і нават пісалі на самастойных літаратурных армянскіх мовах. Усходнеармянскую паэзію канца XIX—пачатку XX стагоддзяў характарызуюць шматлікія дакументы, якія адносяцца да творчасці Аванеса Туманяна, Авеціка Ісаакяна, Вана Тэрана і іншых. Заходнеармянская літаратура таго ж часу паказана з меншай паўнатой, але з няменшай любоўю. Тут мы бачым кнігі і рукапісы празаікаў Грыгара Захраба, Рубена Зардарана, паэтаў Даніэла Варужана і Сіаманта (Атама Ярджарана).

Вельмі каштоўны раздзел армянскай перыёдыкі, дзе сабраны ўнікальныя экземпляры соцень розных часопісаў і газет, якія выдаваліся на армянскай мове ва ўсіх канцах зямнога шара за апошнія 100—120 гадоў.

Старанна захоўваецца ў зале мемарыяльнай выстаўкі калекцыя бібліятэк—каля дзесяці тысяч кніг, якія перададзены музею зарубежнымі армянскімі дзеячамі культуры. Сярод іх ёсць унікальныя творы па розных галінах армяназнаўства на армянскай і заходнееўрапейскіх мовах.

Звяртаюць на сябе ўвагу арыгінальныя мастацкія палотны і скульптурныя бюсты, якія экспануюцца на выстаўцы. У прыватнасці, вельмі добры партрэт паэта Чарэнца работы Марціроса Сар'яна.

Мемарыяльную выстаўку армянскіх пісьменнікаў—гэты своеасаблівы асяродак славы—ахвотна наведваюць госці Ерэвана, савецкія і замежныя турысты.

АДН.

Л. М. ЛІТВІНАЎ

Пасля цяжкай хваробы ў г. Казані памёр заслужаны дзеяч мастацтва БССР і Татарскай АССР Леў Маркавіч Літвінаў.

Больш трыццаці год свайго жыцця Л. Літвінаў аддаў справе развіцця тэатраў нашай рэспублікі. На працягу некалькіх год ён узначальваў творчы калектыў Акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы. Л. Літвінаву належыць пастаноўка шэрагу спектакляў: «Паўлінка» Я. Купалы, «Рамео і Джульета» В. Шэкспіра, «Канец дружбы» К. Крапівы, «Бацькаўшчына» К. Чорнага, «Салавей» Зм. Бядулі, «Гэта было ў Мінску» А. Кучара, «Неспакойная старасць» Л. Рахманава, «За тых, хто ў моры» Б. Лаўрэнёва, «Позняе каханне» А. Астроўскага, «Дзень цудоўных падманаў» Р. Шэрыдана, якія вызначаюцца глыбінёй раскрыцця зместу і высокім прафесійным майстэрствам.

Шмат сваёй энергіі, вопыту, ведаў аддаў нябожчык выхаванню акцёрскай моладзі. Л. Літвінаў з'яўляецца адным з арганізатараў Беларускага тэатральнага аб'яднання.

Апошнія гады ён быў рэжысёрам Казанскага Вялікага драматычнага тэатра імя В. Качалава, дзе паставіў «Лявоніху на арбіце» А. Макаёнка, якая карыстаецца вялікім поспехам. Да апошніх дзён свайго жыцця Л. Літвінаў не парываў сувязі з дзеячамі беларускага тэатральнага мастацтва, у сэрцах якіх надоўга захаваецца аб ім светлая памяць.

Беларускае тэатральнае аб'яднанне.

Іх норавы, іх мараль

Аддзел вядзе загадчык кафедры замежных моў Віцебскага медыцынскага інстытута Л. А. АБРАМЕНКА.

Факты з зарубежных газет і часопісаў

«ЭРАС» ВЯРБУЕ ЧЫТАЧОЎ

«У наступных нумарах нашага часопіса будзе пачата публікацыя серыі фатаграфій, якія адлюстроўваюць сексуальнае жыццё славутай актрысы Мэрылін Манро, якая летась пакончыла жыццё самагубствам. За некалькі тыдняў да смерці Мэрылін вырашыла пазіраваць для цэлай серыі сексуальных фатаграфій. Па яе задуме, гэтыя фатаграфіі павінны быць апублікаваны праз некаторы час пасля яе смерці, каб прыцягнуць цікавасць публікі і памагчы захаваць яе вобраз у памяці нашчадкаў.

Падпісвайцеся на наш часопіс—самы дарагі не толькі ў Амерыцы, але і ва ўсім свеце. Цана нумара — дзесяць долараў».

З аб'яў часопіса «Эрас».

З ПІЎНЫХ БУТЭЛЕК

Амерыканскі мастак Стэнлі Вільдэруотэр, які цяпер служыць у акупацыйных войсках у Японіі, прадставіў на выстаўку рад новых работ. Яго карціны выкананы без выкарыстання фарбаў і пэндзаляў. Мастак збірае каляровыя бутэлькі з-пад віскі і лікёраў, разбівае іх малатком на дробныя асколкі і выкладвае з іх на палатне розныя карціны. У яго ўжо зроблена 18 такіх карцін. Тэматыка ўсіх іх адна—выбух атамнай бомбы.

«Вохенпост».

НАВЕЙШАЯ МУЗЫКА

Па тры маркі заплацілі за ўваходны білет гледачы «Міжнароднага фестывалю навейшай музыкі», які адбыўся ў Вісбадэне. За гэтыя грошы яны маглі ўбачыць некалькі незвычайных нумароў. Першы з іх называўся «Мандзіяна № 6»: піяніст пабудаваў на клавішах раяля піраміду з дзіцячых кубікаў, потым ускочыў на струны раяля і сфатаграфаваў кубікі, якія падаюць. Змест другога нумара такі ж арыгінальны: на клавішы раяля паставілі міску, разбілі ў яе яйка і пачалі ўзбіваць бялок... Пасля заканчэння канцэрта ад двух раяляў засталіся толькі трэскі. Бургамістр горада Вісбадэна бясплатна прадаставіў для фестывалю гарадскую канцэртную залу і ўзяў на сябе ўсе выдаткі, звязаныя з правядзеннем фестывалю.

«Морген».

ШЭКСПІР ПАД ЗАБАРОНАЮ

Па рашэнню школьных улад Капскай правінцыі (Паўднёва-Афрыканскі Саюз.—**Рэд.**) з праграм гімназій выключана вывучэнне «Атэла» Шэкспіра. Атэла і Дэздэмона маюць розны колер скуры, а па сучасных законах шлюбы паміж белымі і каляровымі забараняюцца.

«Ліберасьён».

НАВУКА АБ НЕРВАХ

Вядомы аўстралійскі вучоны-неўролаг Джон Герон на працягу раду гадоў праводзіў навуковыя даследаванні з мэтай устанавіць прычыну захворванняў нервовай сістэмы ў сямейных людзей. Вучоны лічыць, што прычынай нервовых захворванняў з'яўляецца стрыманасць мужа і жонкі ў час сямейных скандалаў. На думку прафесара Герона, для захавання здаровай нервовай сістэмы неабходна мець у кватэры гуканепранікальныя сцены, дзверы і вокны, каб муж і жонка маглі высвятляць адносіны на ўвесь голас, не баючыся прыцягнуць увагу суседзяў і прахожых на вуліцы.

«Фольксштыме».

ПАД РАСКОШНАЙ ВОКЛАДКАЙ

Нядаўна выйшаў з друку новы твор вядомага лірыка Базона Брока. Кніга складаецца з 2.200 чыстых старонак у раскошнай вокладцы. Кожны экземпляр мае аўтограф самога Базона Брока.

«Дойчэ Цайтунг».

НА ВЫПАДАК АБАРОНЫ

Згодна пастановы Вярхоўнага суда Вестфаліі аб праве нашэння зброі, работадаўцы маюць права насіць з сабою ручную агнястрэльную зброю на выпадак абароны ад сваіх падначаленых. Рэкамендуецца насіць гэтую зброю адкрыта, каб яна была відаць усім.

«Вохенпост».

З ВІЗІТНАЙ КАРТКАЙ

Заснаваны нядаўна «Дынерс клуб» у Франкфурце-на-Майне ўжо налічвае каля шасці тысяч членаў. У бліжэйшыя дні іх колькасць павялічыцца яшчэ на паўтары тысячы чалавек. Дэвізам клуба з'яўляецца: «Жыві па-сучаснаму і плаці па-сучаснаму!» Членам клуба можа быць толькі той, чый гадавы даход не ніжэй ста тысяч марак. Членам клуба не трэба, як іншым смяротным, адлічваць грошы, плацячы ў гасцініцы, рэстаране і розных увесяляльных установах. Дастаткова толькі паказаць візітную картку клуба, і ўсе разлікі будуць праведзены праз дырэкцыю клуба. Па прад'яўленню візітнай карткі члены клуба могуць неадкладна атрымаць месца на самалёце, цягніку, параходзе. Візітная картка франкфурцкага клуба мае дзеянне не толькі на тэрыторыі федэральнай рэспублікі, але і ў Рыме, Парыжы і іншых гарадах.

«Кёльнер Штадтанцайгер».

СТРЫПТЫЗ СА СЦЯГАМІ

Ва ўвесяляльных установах Ізраіля вялікай папулярнасцю карыстаецца так званы стрыптыз са сцягамі. Актрысы абгорнутыя ў нацыянальныя сцягі Францыі, Італіі, Грэцыі, Турцыі і іншых краін, выходзяць на сцэну. Калі аркестр пачынае выконваць гімн адпаведнай краіны, актрыса разгортвае сцяг (які з'яўляецца яе адзіным адзеннем) і ўрачыста маршыруе па сцэне. І рэчаскі консул пан Эліас Зіновіус, які спрабаваў пратэставаць супраць глумлення над сцягам яго краіны, дастаўлен у бальніцу з праломам чэрапа. Гаспадар установы зламаў крэсла на яго галаве.

«Морген».

НА КАНАЦЕ

Швед Алан Лундберг і немец Рыкардо Шнайдэр устанавілі новы сусветны рэкорд працягласці стаяння на нацягненым канаце. На працягу ста гадзін яны балансірвалі на канаце. Абодва рэкардсмены знаходзяцца ў стане вялікай стомленасці і знясілення.

«Ліберасьён».

Галоўны рэдактар Н. Е. ПАШКЕВІЧ.

Рэдакцыйная калегія: З. І. АЗГУР, А. І. БУТАКОЎ, К. Л. ГУБАРЭВІЧ, Т. А. ДУБКОВА, Г. М. ЗАГАРОДНІ, В. Б. ЛАДЫГІНА, В. Ул. ІВАШЫН, А. М. КАШКУРЭВІЧ, А. Н. МАРЦІНОВІЧ (адказны сакратар), П. М. МАКАЛЬ, І. А. САНКОВА, Р. К. САБАЛЕНКА (намеснік галоўнага рэдактара), З. Ф. СТОМА, М. Г. ТКАЧОЎ, Р. Р. ШЫРМА.

«Література і мастацтва» выходзіць у аўторак і пятніцу.

НАШ АДРАС І ТЭЛЕФОНЫ: г. Мінск, вул. Захарава, 19.
Тэлефоны: прыёмнай рэдакцыі — 3-24-61, намесніка галоўнага рэдактара — 3-25-25, адказнага сакратара — 3-25-25, аддзела літаратуры — 3-22-04, аддзела мастацтва — 3-24-62, аддзела культуры — 3-22-04, аддзела інфармацыі — 3-24-61, выдавецтва — 3-19-52, бухгалтэрыі — 3-11-03.

«Литература и искусство» — орган Министерства культуры и правления Союза писателей БССР. Минск.

Індэкс 63856 Друкарня выдавецтва «Звязда». АТ 09815